МОСКВА 19 УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН.ТУТ СОВ.СТРОИТ.И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦКіМККП(б)Б, ЦВКіСНК БССР

№ 52 (5726) | 4 сакавіка 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Пастанова IV сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі XI склікання — Аб дзяржаўным бюджэце Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі на 1937 г.

У Совеце Народных Камісараў БССР: Перадача прадпрыемстваў ОРС'аў Наркамунутгандлю БССР; Аб развіцці краязнаўчай і музейнай справы ў БССР; Будаўніцтва і работа калгасных лазняў.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Да канца выкарчаваць вузкае дзяляцтва.

І. Сурта — Мы смела ідзем да комунізма.

І. Рудакоў — Лясная прамысловасць БССР у 1937 годзе.

Т. Хадкевіч — Здзекі замест выхавання.

С. Г. — Напярэдадні першага тыражу новай пазыкі.

Пахаванне Юрыя Майсеевіча Пэна.

За рубяжом:

На франтах у Іспаніі;

Англія пасылае ў Іспанію 130 кантралёраў;

Рыбентроп патрабуе калоній;

Новы міністр замежных спраў Японіі;

Паездка амерыканскага пасла па паўднёвых прамысловых раёнах Совецкага Саюза;

Спрэчкі па знешняй палітыцы Англіі ў палаце абшчын.

ДА КАНЦА ВЫКАРЧАВАЦЬ ВУЗКАЕ ДЗЯЛЯЦТВА

Мацнее з кожным днём социялістычная дзяржава рабочых і сялян СССР, не гледзячы на прошукі класавых ворагаў, шпіянаж, шкодніцтва, тэрарыстычную і дыверсійную дзейнасць подлай трацкісцкай банды і правых контрэволюцыянераў. Выхоўваючы ў масах рэволюцыйную пільнасць, выганяючы добрадушнасць і ратазейства, гераічная комуністычная партыя абрушвае меч пролетарскай дыктатуры на ворагаў социялізма, прытаіўшыхся ў сваіх бандыцкіх логавах. Дзяржава, ахоўваючы інтарэсы рабочых і сялян, убірае з дароті пераможна ідучага да комунізма рабочага класа подлую фашысцкую зграю.

Рабочыя і сяляне, мабілізуючыся на барацьбу за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, узброеныя нашай партыяй і вялікім Сталіным вострай зброяй большэвіцкай самакрытыкі, выцягваюць на свет божы астаткі прытаіўшыхся ворагаў народу.

Рабочыя і сяляне Беларусі на чале з КП(б)Б, усведамляючы сваю адказнасць перад прапоўнымі СССР за ахову заходніх граніц сваёй шчаслівай радзімы, адказваючы на заклік ЦО нашай партыі «Правды», высока ўзнялі сцяг барацьбы з вынікамі шкодніцтва.

ЦК КП(б)Б Беларусі глыбока прадумаў і зрабілі ўсе вывады з фактаў шкодніцтва, меўшых месца ў БССР. Мудрае ўказанне ЦК ВКП(б) і таварыша Сталіна аб тым, што вораг прапаваў беспакарана там, дзе звілі сабе гняздо небольшэвіцкія метады работы, КП(б)Б паклала ў аснову праверкі ўсёй сваёй практыкі. Непасрэдным штуршком да гэтай праверкі паслужылі напярэджанні ЦК ВКП(б) партыйным арганізацыям у сувязі з фактамі страты пільнасці ў Растоўскай і Кіеўскай арганізацыях. На неаднаразовых нарадах з партыйнымі работнікамі і на апошнім сваім пленуме ЦК КП(б)Б напярэдзіў партыйныя арганізацыі аб необходнасці змяніць практыку работы, перанесцы цэнтр цяжару на арганізацыю партыйнай работы і выхаванне комуністаў, рашуча выкарчоўваючы небольшэвіцкія метады работы.

Пленум ЦК КП(б)Б, ацэньваючы факты страты рэволюцыйнай пільнасці і дзяляцтва ў лепельскай, быхаўскай і іншых партыйных арганізацыях Беларусі, указаў, што партыйныя арганізацыі Беларусі «не зрабілі яшчэ ўсіх необходных высноў з неаднаразовых напярэджанняў ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна аб бязлітаснай барацьбе з арганізацыйнай распушчанасцю і необходнасцю ўзьдыму партыйна-арганізацыйнай, прапагандысцкай і палітыка-выхаваўчай работы.

Толькі стратай пільнасці і перадавер'ем другарадным людзям такой важнейшай справы, як праверка людзей, можна тлумачыць той факт, што ўжо пасля абмену партыйных дакументаў у КП(б)Б былі выкрыты контрэволюцыйныя трацкісцкія фашысцкія элементы, якім удалося абмануць партыю і атрымаць новыя партыйныя дакументы.

Пленум ЦК адзначае, што работа партыйных арганізацый над ідэйнай загартоўкай комуністаў, павышэннем узроўню партыйнага жыцця і рэволюцыйнай боездольнасці кожнага комуніста ўсё яшчэ астаецца зусім нездавальняючай. Партарганізацыі КП(б)Б, не гледзячы на неаднаразовыя ўказанні і напярэджанні ЦК КП(б)Б, не забяспечылі да гэтага часу такой арганізацыі палітычна завостранай партыйнай прапаганды, якая ўзброіла-б масы ў іх барацьбе з ворагамі социялізма. У радзе партыйных арганізацый, як гэта было ўскрыта праверкай і абменам партыйных дакументаў, на глебе зняважлівых адносін да пытанняў партыйнай работы, выпрошчвання і выхавання ў духу большэвіцкай прынцыповасці партыйных кадраў, вырасталі самазаспакоенасць і добрадушнасць. Крытыка і самакрытыка ў радзе партыйных арганізацый разгорнута зусім недастаткова. Гэта палягчае ворагу магчымасці маскіравацца і скарыстоўваецца контрэволюцыйным трацкісцкім атрэд'ем для сваёй гнуснай падрыўной дзейнасці...

Пленум ЦК абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі КП(б)Б неадкладна перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з указаннямі ЦК ВКП(б) па Азова-Чорнаморскай і Кіеўскай партыйных арганізацыях.

З усёй бязлітаснасцю бюро ЦК КП(б)Б раскрытыкавала памылкі практыкі раду аддзелаў ЦК КП(б)Б, як зусім правільна было ўказана ў «Правде» ад 1 сакавіка 1937 года, — захапляўшыхся гаспадарчай работай, памяняўшых адпаведныя наркаматы замест таго, каб арганізаваць партыйна-масавую работу на прадпрыемствах, МТС, соўгасах, калгасах, сярод настаўнікаў і гандлёвых работнікаў і ажыццяўляць палітычнае кіраўніцтва. У гэтых умовах некаторыя райкомы КП(б)Б, аддаўшыя забыцю партыйную работу ва ўгоду дзяляцкаму захапленню гаспадарчымі пытаннямі, не толькі своечасова не папярэджваліся, але аб'ектыўна нават заахвочваліся адпаведнымі аддзеламі ЦК КП(б)Б. Небольшэвіцкія метады работы, падмена совецкіх органаў, зрыў дзіцінначалля, непартыйныя норавы ў падборы работнікаў, калі асобы, або мужчыны, або жанчыны, не маючыя неабходных паўнамоцтваў, аказвалі ўплыў на назначэнне работнікаў, своечасова не выкрываліся, што аблягчала работу ворагаў. Вораг карыстаўся ратазействам комуністаў у Віцебску, Лепелі, Гомелі, Оршы, Быхаве, Барысаве і інш., арганізуючы шкодніцкую работу і контрэволюцыйную агітацыю на радзе прадпрыемстваў, калгасаў, школ і т. д.

У пастанове бюро ЦК КП(б)Б ад 8 студзеня 1937 года прама ўказвалася, што «і аддзелы ЦК КП(б)Б яшчэ не змаглі перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з патрабаваннямі палітычнага кіраўніцтва, у прыватнасці ў справе кантролю за ажыццяўленнем важнейшых рашэнняў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б, у асаблівасці па пытаннях пільнасці, правядзення ў жыццё статута партыі, ажыццяўлення ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, разгортвання крытыкі і самакрытыкі ў партыйных арганізацыях, а таксама па пытаннях падбору і праверкі людзей і палітычна-выхаваўчай работы з кадрамі.

Той факт, што работа аддзелаў ЦК яшчэ ў вядомай ступені працякае ў абстаноўцы дзяляцкай ціхусці, а рад сур'ёзных палітычных спраў і зрываў у рабоце некаторых партыйных арганізацый своечасова не выкрываецца і справа ў радзе выпадкаў не даводзіцца да канца, — сведчыць аб нездавальняючай яшчэ рабоце аддзелаў ЦК. У асаблівасці гэта падкрэсліваецца тым, што ў час праверкі і абмену партыйных дакументаў вялікая колькасць кіруючых кадраў, якія падбіраліся і правяраліся аддзеламі ЦК, былі выкрыты як прамыя ворагі.

Бюро ЦК лічыць, што сакратары ЦК таксама павінны ўзмацніць сваё штодзённае кіраўніцтва і неаслабны кантроль над работай аддзелаў ЦК і партыйных арганізацый Беларусі.

Бюро ЦК прапануе АК, ГК і РК КП(б)Б абмяркоўваць гэта рашэнне ЦК КП(б)Б, зрабіўшы з яго ўсе неабходныя палітычныя і практычныя высновы ў сваёй рабоце, у асаблівасці ўлічваючы, што КП(б)Б працуе ў пагранічных умовах».

Гэта суровая большэвіцкая крытыка практыкі работы КП(б)Б павінна паслужыць сігналам да разгортвання большэвіцкай самакрытыкі — выпрабаванай зброі большэвізма ў барацьбе з ворагамі і арганізацыйнай распушчанасцю, якая зусім яшчэ не пераможана ў радзе партыйных арганізацый Беларусі.

Большэвікі Беларусі працуюць на тэрыторыі, якая мяжуе з капіталістычным, варожым нам светам. Вось чаму прапаваць нам патрэбна асабліва чотка, бязлітасна выганяць ратазейства, добрадушнасць, расхлябанасць, вузкае дзяляцтва, асабліва чула прыслухоўваючыся да голасу мас, узнімаючы сцяг самакрытыкі і рэволюцыйнай пільнасці.

Бамбардыроўка Мадрыда

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 3 сакавіка. (БЕЛТА). Камітэт абароны Мадрыда апублікаваў сёння ў поўдзень наступнае паведамленне:

«Германскія батарэі цяжкай артылерыі, якія знаходзяцца ў распараджэнні мяцежнікаў і размешчаны за ўзвышшам Лос-Анхелес, бамбардыравалі рабочы квартал Мадрыда Кавашэс. Ёсць шмат афіяр сярод грамадзянскага насельніцтва, а таксама нанесена значная матэрыяльная шкода.

Мяцежнікі разгарнулі атаку на пазіцыі ўрадавых войск на ўчастку паміж Мораты дэ Тахунья і Вальекас (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) Не гледзячы на тое, што мяцежнікі ўвялі ў бой значныя і вельмі добра ўзброеныя сілы, іх атака была зломлена аб супраціўленне республіканскай арміі».

Новы японскі міністр замежных спраў

ТОКІО (сталіца Японіі), 3 сакавіка. (БЕЛТА). Прыбыўшы днём у сталіцу японскі пасол у Парыжы Сато сёння назначан міністрам замежных спраў. Сато 55 год. На дыпламатычнай службе знаходзіцца звыш 20 год. З 1906 па 1914 год быў сакратаром японскага пасольства ў Расіі. З 1914 па 1919 быў генеральным консулам у Харбіне. У 1925 годзе Сато быў першым павераным у справах Японіі ў Маскве.

Паездка амерыканскага пасла

З сакавіка ў Маскву вярнуўся пасол ЗША п. Дэвіс. На працягу мінулага тыдня п. Дэвіс зрабіў паездку па паўднёвых прамысловых раёнах Совецкага Саюза. Пасол паведаў рад буйных заводаў і іншых прамысловых прадпрыемстваў.

У паездцы пасла суправаджалі чыны пасольства ЗША ў Маскве, а таксама карэспандэнты амерыканскага друку.

(БЕЛТА)

Спрэчкі па знешняй палітыцы Англіі ў палаце абшчын

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 2 сакавіка. (БЕЛТА). У палаце абшчын (англійскім парламенце) у спрэчках па знешняй палітыцы ліберал Мандэр, закрануўшы падзеі ў Іспаніі, падкрэсліў, што ў апошні час германскія і італьянскія судны сумесна прымалі ўдзел у нападзе на тэрыторыю іспанскага ўрада, у тым ліку на Малагу. Паколькі Германіі і Італіі прадастаўляецца нагляд за берагамі Іспаніі. Мандэр задаў пытанне: «Хто будзе наглядаць за наглядальнікамі?». Даручаць нагляд за іспанскім узбярэжжам германскім і італьянскім суднам, — падкрэсліў ён,— значыць ісці на ўскладненні.

Галахер (комуніст) задаў пытанне: Чаму ўрад не прыходзіць да пагаднення з Францыяй, СССР і Чэхаславакіяй аб абароне міру?

Палата абшчын ухваліла знешнюю палітыку ўрада, адхіліўшы большасцю 243 супроць 134, унесеную лейбарыстамі рэзалюцыю аб скарачэнні бюджэта міністэрства замежных спраў.

Аб дзяржаўным бюджэце Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі на 1937 год

Пастанова IV Сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР XI склікання

Разгледзеўшы прадстаўлены Советам Народных Камісараў БССР праект дзяржаўнага бюджэта Беларускай ССР на 1937 год і заключэнне па ім Бюджэтнай Камісіі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР у адпаведнасці з пастановай III Сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Союза ССР VII склікання ад 13 студзеня 1937 года «Аб дзяржаўным бюджэце Союза ССР на 1937 год», **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць звод даходаў і расходаў дзяржаўнага бюджэта Беларускай ССР на 1937 год са зменамі, прапанаванымі Бюджэтнай Камісіяй, у наступных сумах:

Даходы (у тыс. руб.)

ДАХОДЫ АГРАМАДЖАНАЙ ГАСПАДАРКІ:	
1. Падатак з абароту	592.844
2. **Адлічэнні ад прыбытку:**	
а) прамысловасці НК Мясцпрома	117.040
б) прадпрыемстваў НК Земляробства	685
в) прадпрыемстваў НК Унутранага гандлю	1.520
г) іншых платнікаў	4.795
Разам адлічэнняў ад прыбытку	**124.040**
3. Падаходны падатак і іншыя падаткі з прадпрыемстваў і арганізацый:	
а) падаходны падатак з кааперацыйных арганізацый	420
б) падатак з нетаварных аперацый	9.000
в) падаходны падатак з калгасаў	13.120
г) падатак з соўгасаў	660
Разам падаткаў з прадпрыемстваў і арганізацый	23.200
Разам даходаў ад аграмаджанай гаспадаркі	**740.084**
II. Дзяржаўныя пазыкі, якія рэалізуюцца сярод насельніцтва	**31.750**
III. Падаткі і зборы з насельніцтва:	
а) сельскагаспадарчы падатак з калгаснікаў і адпаасобных сялянскіх гаспадарак	20.770
б) збор на патрэбы жыллёвага і культурнага будаўніцтва ў горадзе	14.250
в) збор на патрэбы жыллёвага і культурнага будаўніцтва ў вёсцы	25.300
Разам падаткаў і збораў з насельніцтва	60.320
IV. Адлічэнні ад страхавых плацяжоў	**5.150**
V. Іншыя даходы	**1.500**
Усяго даходаў	**838.804**

Расходы (у тыс. руб.)

I. Народная гаспадарка:	
1. Прамысловасць НК Мясцпрома	33.027
2. Кінопрамысловасць	8.850
Разам па прамысловасці	41.877
3. Сельская гаспадарка, падпарадкаваная Наркамзему	22.812
4. Комунальная і жыллёвая гаспадарка	4.183
5. Дзяржаўны гандаль	120
6. Іншыя расходы па народнай гаспадарцы	1.562
Разам на народную гаспадарку	70.554
II. Социяльна-культурныя мерапрыемствы:	
1. Асвета	162.769
2. Ахова здароўя	65.340
3. Фізічная культура	1.330
4. Социяльнае забяспечанне	1.915
Разам на социяльна-культурныя мерапрыемствы	231.354
III. Народны камісарыят юстыцыі і Пракуратура	**9.623**
IV. Кіраўніцтва	**19.605**
V. Расходы па пазыках	**3.660**
VI. Рэзервны фонд СНК	**4.000**
VII. Расходы за кошт адлічэнняў ад страхавых плацяжоў	**5.150**
VIII. Іншыя расходы	**7.155**
Разам даходаў без сродкаў, перадаваемых мясцовым бюджэтам	351.101
IX. Сродкі, перадаваемыя мясцовым бюджэтам	**487.703**
Усяго расходаў	**838.804**

2. Ухваліць кантрольныя лічбы мясцовых бюджэтаў Беларускай ССР на 1937 год па даходах і расходах у суме **пяцьсот восемдзесят восем мільёнаў чатырыста дваццаць тысяч рублёў**, паводле далучаемага звода.

3. Адзначаючы нездавальняючае становішча бюджэтнай работы ў паасобных наркаматах, горсоветах, райвыканкомах і сельсоветах, асабліва па лініі эфектыўнага скарыстання бюджэтных асігнаванняў на бытавыя і социяльна-культурныя мерапрыемствы, дзіцячыя ўстановы, харчаванне і абсталяванне лекавых устаноў, дабрабыт і інш. мерапрыемствы, абавязаць наркаматы, советы і выканкомы ўстанавіць у 1937 годзе сапраўды дзейны кантроль за своечасовым разгортваннем і далейшым рашучым палепшаннем работы сеткі социяльна-культурных устаноў з прыцягненнем да кантролю шырокай грамадскасці.

4. Абавязаць народны камісарыят фінансаў БССР, горсоветы і райвыканкомы забяспечыць строгае ажыццяўленне ўстаноўленага пастановай III Сесіі ЦВК Саюза ССР VII склікання, парадку зацверджання гадавых справаздач аб выкананні мясцовых бюджэтаў.

ЦВК БССР ставіць перад усімі советамі, гаспадарчымі органамі і грамадскімі арганізацыямі задачу забяспечыць безумоўнае выкананне даходаў дзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў на 1937 год, найстражэйшае захаванне планавай і фінансава-бюджэтнай дысцыпліны і ўсямерны клопат аб далейшым умацаванні совецкага рубля.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯУКОЎ.

20 лютага 1937 года.
г. Менск. Дом урада.

ЗВОД КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР НА 1937 г.

(у тыс. руб.)

ДАХОДЫ	
I. Мясцовыя даходы	
1. Прамысловасць	3.368
2. Сельскагаспадарчая маемасць	604
3. Лясная гаспадарка	15.378
4. Комунальная і жыллёвая гаспадарка	9.163
5. Гандлёвыя арганізацыі	2.475
6. Мясцовыя падаткі і зборы:	
а) падатак з будынкаў	4.500
б) зямельная рэнта	3.100
в) іншыя мясцовыя падаткі	3.500
Разам мясцовых падаткаў і збораў	11.100
7. Розныя даходы	8.125
Разам мясцовых даходаў	50.213
II. Дзяржпадаткі, не праходзячыя па дзяржбюджэту	
1. Падаходны падатак з кааперацыйных арганізацый	19.250
2. Падаходны падатак з фізічных асоб	27.950
3. Адзіная дзяржаўная пошліна	3.184
4. Іншыя падаткі	120
Разам дзяржпадаткаў, не праходзячых па дзяржбюджэту	50.504
III. Сродкі, перадаваемыя з дзяржбюджэта	
Адлічэнні ад дзярждаходаў	
1. Ад сельскагаспадарчага падатку	20.770
2. Ад падаходнага падатку з калгасаў	13.120
3. Ад дзяржаўных пазык, рэалізуемых сярод насельніцтва	20.830
4. Ад культзбораў у горадзе	14.250
5. Ад культзбору ў сельскіх мясцовасцях	25.300
6. Ад падатку з соўгасаў	495
7. Ад падатку ад нетаварных аперацый	9.000
8. Ад падатку з абароту	383.938
Разам сродкаў, перадаваемых з дзяржбюджэта	487.703
Усяго даходаў	**588.420**
РАСХОДЫ	
I. Народная гаспадарка:	
1. Прамысловасць	8.356
2. Сельская гаспадарка	12.760
3. Лясная гаспадарка	350
4. Комунальная і жыллёвая гаспадарка	49.596
5. Гандлёвыя арганізацыі	3.881
6. Дарожная гаспадарка	10.200
7. Народная сувязь	3.341
Разам на народную гаспадарку	88.484
II. Социяльна-культурныя мерапрыемствы:	
1. Асвета	316.351
2. Ахова здароўя	122.154
3. Фізкультура	1.720
4. Социяльная забяспечанне	5.813
Разам на социяльна-культурныя мерапрыемствы	446.038
III. Кіраўніцтва	39.703
IV. Расходы па пазыках	842
V. Рэзервныя фонды	4.500
VI. Іншыя расходы	8.853
Усяго расходаў	**588.420**

Рэкорды макееўскіх сталявараў

МАКЕЕЎКА, 3 сакавіка. (БЕЛТА). Уступіўшы на стаханаўскую вахту памяці Серго Орджанікідзе, сталявары печы № 6 нова-мартэнаўскага цэха Макееўскага металургічнага завода імя Кірава выплавілі 1 сакавіка 600 тон сталі. З квадратнага метра поду печы знята 9,5 тоны сталі. Новая тэхнічная магутнасць мартэна перакрыта. 2 сакавіка сталявар шостай печы тав. Шкурыгін зняў з кв. метра поду печы 10,2 тоны.

Дапамога сем'ям загінуўшых маракоў ледакола „Семерка"

Народны камісар воднага транспарту тав. Н. І. Пахомаў прапанаваў начальніку Чорнаморскага параходства неадкладна выдаць сем'ям загінуўшых у часе шторму на Чорным моры маракоў ледакола «Семерка» трохмесячны аклад заработнай платы. Нарком распаразіўся таксама забяспечыць вучэбнымі стыпендыямі дзяцей загінуўшых маракоў ледакола «Семерка».

Мітынг памяці героя-пагранічніка

СЯЛО ПРЫШЫБ (Харкаўская вобласць), 3 сакавіка. (БЕЛТА). У сяле Прышыб адбыўся шматлюдны мітынг памяці па-геройску загінуўшага ў баю з япона-манчжурамі пагранічніка-гранатамётчыка Максіма Панчэнка. На мітынг прыбыла каля 4 тыс. калгаснікаў з суседніх сёл, чырвонаармейцаў, школьнікаў. Калгаснік арцелі «Перамога» тав. Дудка расказаў аб жыцці Максіма, выхаванага ленінскім комсамолам.

Усе выступаўшыя заявілі аб сваёй гатоўнасці ў любую мінуту стаць на абарону социялістычнай радзімы. Калгаснікі хадайнічаюць перад ЦВК УССР аб перайменаванні сяла Прышыб у сяло Панчэнкава.

Прыезд гросмайстра Файна

НЕГАРЭЛАЕ, 3 сакавіка. (Карэспандэнт «Звязды»). Сёння прыехаў з Галандыі вядомы шахматыст Файн. У гутарцы гросмайстар Файн паведаміў, што ў СССР ён прыязджаў упершыню і накіроўваецца ў Маскву, дзе адбудзецца яго сустрэча з совецкімі шахматыстамі.

— З совецкіх шахматыстаў я знаём з гросмайстрам Батвінікам, з якім сустракаўся на міжнародным шахматным турніры ў Натынгэме. Батвінік іграе настолькі добра, што мае ўсе шансы для ўдзелу ў спаборніцтвах на чэмпіёна свету.

Другіх совецкіх майстроў я ведаю па шахматнай прэсе і буду рад сустрэцца з імі ў Маскве. Пытанне аб наведанні мною другіх гарадоў СССР і ў прыватнасці сталіцы Совецкай Беларусі — Менска, высвятліцца ў Маскве.

Відаць, мне будзе прадастаўлена магчымасць сустрэцца з шахматыстамі і іншых гарадоў.

У Совецкім Саюзе, маю намер прабыць каля месяца.

КАМЕНКОЎ.

У СНК БССР

ПЕРАДАЧА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ОРС'аў НАРКАМУНУТГАНДЛЮ БССР

Соўнарком Беларусі прыняў пастанову аб перадачы з 1 сакавіка ў сістэму Наркамунутгандля БССР усёй рознічнай гандлёвай сеткі і сеткі грамадскага харчавання, якая належыць ОРС'ам.

Наркамунутгандлю перадаюцца прадпрыемствы ОРС'аў віцебскіх фабрык «КІМ», імя Клары Цэткін, імя Кагановіча і «Сцяг індустрыялізацыі», гомельскага і новабарысаўскага шклозаводаў, магілеўскай шоўкавай фабрыкі, аршанскага Белэнергакамбіната і заводаў імя Ланцуцкага (Гомель) і імя Мяснікова (Менск).

Наркамунутгандлю перадаюцца таксама належаўшыя ОРС'ам склады, хавальнікі гародніны, усе загатоўчыя пункты ОРС'аў з маемасцю, абсталяваннем і / таварнымі астачамі па балансах на 1 студзеня 1937 года, увесь аўта-гужавы транспарт разам з гаражнай гаспадаркай і ўся навучальная сетка па падрыхтоўцы гандлёвых кадраў.

Соўнарком абавязаў начальнікаў ОРС'аў, дырэктароў заводаў і фабрык перадаваць арганізацыям, якія прымаюць гаспадарку ОРС'аў, усе канторскія памяшканні, займаемыя гандлёвымі апаратамі ОРС'аў. За гандлёвымі работнікамі ОРС'аў, якія пераходзяць у сістэму Наркамунутгандля, захоўваюцца на ранейшых умовах кватэры і зарплата.

Для вырашэння спрэчных пытанняў, якія могуць узнікнуць у працэсе перадачы ОРС'аў сістэме Наркамунутгандля, створана камісія ў складзе намесніка старшыні СНК БССР т. Любовіча (старшыня), Геаргадзе, Гуревіча, Матусевіча і Трыфсіка.

АБ РАЗВІЦЦІ КРАЯЗНАЎЧАЙ І МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ У БССР

Соўнарком Беларусі вынес спецыяльную пастанову аб развіцці краязнаўчай і музейнай справы ў БССР, у якой адзначана, што краязнаўчыя арганізацыі да гэтага часу не сувязаўляліся з задачамі вывучэння вытворчых сіл і прыродных багаццяў рэспублікі і не ўцягнулі ў краязнаўчую работу шырокіх мас працоўных.

Соўнарком абавязаў краязнаўчыя арганізацыі перабудаваць усю работу, якая павінна быць увязана з канкрэтным планам будаўніцтва кожнага раёна прадпрыемства, соўгаса і калгаса. У краязнаўчую работу трэба ўцягнуць рабочых, калгаснікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, аграномаў, урачоў, настаўніцтва.

Устаноўлена наступная сістэма пабудовы краязнаўчых арганізацый: на прадпрыемствах, у соўгасах, калгасах, школах і ўстановах ствараюцца краязнаўчыя ячэйкі, а ў раённых і акруговых цэнтрах — раённыя і акруговыя бюро краязнаўства пры аддзелах народнай асветы.

Усе акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты абавязаны да 15 сакавіка арганізаваць краязнаўчыя бюро. Музеі арганізуюцца ў Полацку, Лепелі, Слуцку, Мозыры, Гаралку, Оршы, Барысаве, Бабруйску, Рэчыцы, Тураве, Мсціслаўлі, Клімавічах, Крычаве і Быхаве.

Пры менскім гістарычным музеі намечана стварыць аддзелы: археалагічны, гістарычны, мастацкі, батанічны, заалагічны і геалагічны. Наркомасветы даручана падрыхтаваць у 1937 годзе праектнае заданне будаўніцтва Дзяржаўнага музея ў Менску.

Соўнарком абавязаў Наркомасветы ўзмацніць кіраўніцтва краязнаўчымі арганізацыямі праз свае органы на месцах. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на арганізацыю і наладжванне работы школьных краязнаўчых гурткоў, абавязаўшы дырэктароў школ забяспечыць куткі юных краязнаўцаў патрэбным абсталяваннем. НКАсветы абавязан выдаць інструкцыю па арганізацыі ў школах заалагічных музеяў, батанічных і мінералагічных габінетаў.

СНК абавязаў НКАсветы і Акадэмію навук БССР выдаць масавым тыражом «Пуперадзіцель па БССР», звярнуўшы асаблівую ўвагу на помнікі грамадзянскай вайны, рэволюцыйнай барацьбы ў БССР і социялістычнае будаўніцтва.

БУДАЎНІЦТВА І РАБОТА КАЛГАСНЫХ ЛАЗНЯЎ

Соўнарком БССР вынес спецыяльную пастанову аб будаўніцтве і рабоце лазняў у калгасах і соўгасах. Соўнарком адзначыў, што акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты і горсоветы слаба выконваюць пастанову XI Усебеларускага З'езда советаў аб будаўніцтве лазняў у калгасах і соўгасах. Асабліва дрэнна пастаўлена гэта справа ў Хойніцкім, Суражскім, Веткаўскім, Круглянскім і Лоеўскім раёнах.

У Жыткавіцкім, Бярэзінскім, Любанскім, Клімавіцкім, Расонскім і іншых раёнах лазні не забяспечваюцца палівам і часта скарыстоўваюцца пад сушылкі ільну, склады і іншыя мэты.

СНК абавязаў выканкомы, гарадскія і сельскія советы ў двухтыднёвы тэрмін праверыць становішча маючыхся ў калгасах і соўгасах лазняў і забяспечыць іх палівам, абсталяваннем і сталым абслугоўваючым персаналам, дабіўшыся ўзорнага санітарнага становішча лазняў і іх рэгулярнай работы.

Кантроль за санітарным утрыманнем лазняў ускладзен на галоўную санітарную інспекцыю НК аховы здароўя і на акруговыя, раённыя і гарадскія аддзелы аховы здароўя.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ЮРЫЙ МАЙСЕЕВІЧ ПЭН

Саюзу совецкіх мастакоў БССР

Падзяляючы ваш смутак, выказваем глыбокае спачуванне з поваду смерці старэйшага беларускага мастака **Ю. М. ПЭНА.**

МАСКОЎСКІ АБЛАСНЫ САЮЗ СОВЕЦКІХ МАСТАКОЎ.

***

Цэнтральнае праўленне саюза работнікаў мастацтва з глыбокім жалем паведамляе аб трагічнай смерці аднаго з выдатнейшых мастакоў БССР Юрыя Майсеевіча, Пэна, наследваўшай у ноч на 1 сакавіка 1937 года.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВА БССР.

***

Оргбюро распубліканскага камітэта саюза кіно-фотаработнікаў выказвае глыбокае спачуванне з поваду трагічнай смерці выдатнейшага мастака БССР Юрыя Майсеевіча Пэна.

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА ФОТО-КІНОРАБОТНІКАЎ.

ПАХАВАННЕ Ю. М. ПЭНА

ВІЦЕБСК, 3 сакавіка. (Кар. «Звязды»). Сёння безупынны паток у залу Палаца працы ўзмацніўся яшчэ больш. Павялічылася колькасць вянкоў ад розных арганізацый, сяброў і прыяцеляў нябожчыка. Міма труны з целам усімі паважанага Юрыя Майсеевіча задумліва, з паніклымі галовамі праходзяць сотні і тысячы працоўных Віцебска, яны развітваюцца з вялікім майстрам кісці, жыццё якога было прысвечана справе народнага мастацтва. Усяго за два дні міма труны з целам Юрыя Майсеевіча Пэна прайшло каля 50 тысяч чалавек.

Апошнюю вахту ганаровай варты нясуць прадстаўнікі Саюза совецкіх мастакоў Беларусі — мастакі Пашкевіч, Керзін, Бразер, Райхман.

У 16 гадзін пад гукі жалобных маршаў труна з целам Юрыя Майсеевіча Пэна выносіцца на пляц Волі. Актуль у суправаджэнні дзесяткаў тысяч працоўных горада жалобная працэсія накіроўваецца да брацкіх могілак. Наперадзе працэсіі шматлікія вянкі, якія беражна нясуць стаханаўцы, мастакі, інжынеры, прыяцелі і сябры нябожчыка.

Жалобны мітынг адкрывае старшыня віцебскага горсовета тав. Сухаручкін.

Старшыня ўрадавай камісіі тав. Сурта, адлюстроўваючы творчы шлях Юрыя Майсеевіча Пэна, як буйнейшага мастака рэалістычнага напрамку выяўленчага мастацтва, ад імя ўрада БССР выказвае спачуванне з поваду смерці Ю. М. Пэна. Тав. Сурта заклікае яшчэ больш узмацніць рэволюцыйную пільнасць, яшчэ цясней згуртавацца вакол партыі Леніна—Сталіна.

Ад імя Віцебскага гаркома партыі, горсовета і горпрофсовета тав. Есько выказвае глыбокі смутак з поваду смерці Юрыя Майсеевіча Пэна, забітага подлай, варожай рукой.

Ад кіраўніцтва па справах мастацтва пры СНК БССР выступае начальнік кіраўніцтва, член урадавай камісіі тав. Пасюкевіч, выказваючы свой жаль з поваду страты вялікага народнага мастака, якім быў Юрый Майсеевіч Пэн.

— Пэн вышаў з народу, быў заўсёды з народам і з'яўляўся сапраўды народным мастаком, — гаворыць ад імя работнікаў мастацтва БССР тав. Грубэ.

Ад стаханаўцаў і ўдарнікаў віцебскіх прадпрыемстваў выступае рабочы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» тав. Каган.

— Віцебскія мастакі, — гаворыць мастак тав. Лейтман, — на прыкладзе любімага Юрыя Майсеевіча Пэна, аддаўшага сваё жыццё за справу народнага мастацтва, будуць яшчэ актыўней прапаваць і тварыць на карысць сваёй любімай радзімы.

Жалобны мітынг закончан. Пад гукі жалобнага марша труна з целам вялікага народнага мастака Юрыя Майсеевіча Пэна апускаецца ў магілу.

Няма вялікага мастака, але ён пакінуў совецкаму народу каштоўнейшую спадчыну — сваю 50-гадовую творчасць, на якой будзе вучыцца наша маладое пакаленне.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Творчасць Юрыя Майсеевіча Пэна



Бетховен

Тып старога яўрэя

ЗДЗЕКІ ЗАМЕСТ ВЫХАВАННЯ

Настаўніца седчынскай чатырохгадовай школы Смілавіцкага раёна Макаровіч прымяняе старыя метады выхавання дзяцей. У часе заняткаў за ўзняты шум у класе яна абвінаваціла майго сына, выкінула яго з-за парты і загадала двум мацнейшым вучням вывесці яго са школы. Не даўшы нават апрануцца, Макаровіч прымусіла майго сына ісці па мяне. У адной кашулі, без шапкі, у снегапад хлопчык прабег паўтара кіламетра. Макаровіч прымяняе, як метад, старую сістэму пакарання: за спазненне прымушае вучняў чакаць перапынку па дваро, вучні застуджваюцца.

Калі я звярнуўся да дырэктара дрычынскай пяцігадовай сярэдняй школы, то апошні заявіў: «Напішыце заяву, разгледзім» і на гэтым супакоіўся.

АДАМ МОТУЗ.

ДРЫЧЫН. (Ад спец. кар. «Звязды»). Пісьмо калгасніка Адама Мотуза заслугоўвае вялікай увагі. Абураючы факт здзекаў над вучнямі сапраўды меў мясцо. Настаўніца Макаровіч на занятках у 3 класе заўважыла шум і смех за партай, дзе сядзеў вучань Валодзя Мотуз. Макаровіч адразу выгнала Мотуза з класа і паслала за бацькам. Перапалоханы, пакрыўджаны вучань, не апрануўшыся, выбег са школы. У сцюжу, з плачам, вучань вымушан быў бегчы за паўтара кіламетра да свайго пасёлка.

Трэба згубіць, самую звычайную чалавечую чуласць, самае простае пачуццё любові да нашых совецкіх дзяцей, каб роўнадушна аднесціся да такога выпадку, як аднесліся да яго і сама настаўніца, і загадчык школы, яе муж Н. Ф. Макаровіч. Іх ніколькі не кранула ні справядлівае абурэнне бацькі, ні апраўданая крыўда хлопчыка. Наадварот, пры высвятленні намі акалічнасцей факта, абодва яны сцвярджалі, што зараз Валодзя Мотуз «стаў дысцыплінаваным і прыкладным вучнем», гэтым самым стараючыся апраўдаць варожы совецкай школе метад пакарання, працягваемы дзе-колечы замаскаваным пад пыльду настаўніка класавым ворагам.

У той-жа седчынскай школе настаўнік Е. Хоцін абраў сістэмай уздзеянічання на недысцыплінаваных вучняў вывад іх з класа. Вучня Янку Мотуза ён выкінуў на вуліцу да наступнага ўрока. Школа не мае карыдора, на дваро — сцюдзёны вецер і снег, прыгуліцца нема дзе. Неапрануты хлопчык пабег дамоў і прастыў. У каго пасля гэтага не з'явіцца апасенне за сваіх дзяцей, пасылаемых да такога, з дазволу сказаць, настаўніка, які сваімі дзеяннямі калечыць дзяцей?

Для школ Дрычынскага сельсовета злачынна грубыя, здзеклівыя адносіны некаторых настаўнікаў да дзяцей — не навіна. У капейніцкай школе настаўніца Ольга Васіленка ўдарыла спыткам вучня Алеся Важніка за заўвагу, што яна няправільна паставіла адзнаку сваёй дачцы-вучаніцы.

Як відаць, мы маем не выпадковыя факты са школ аднаго і таго-ж сельсовета. Здзекі над вучнямі — адна з форм яўнага варожай работы, накіраванай на падрыў аўтарытэта совецкай школы, на зрыў мерапрыемстваў партыі і ўрада па палепшанню работы нашых школ.

І горш усяго, што агідная практыка, дастойная параўнання з палачнай практыкай выхавання дзяцей самай рэакцыйнай часткі дарэволюцыйнага настаўніцтва, вядома і настаўніцкаму калектыву сельсовета, і смілавіцкаму раённаму аддзелу народнай асветы, але прайшла міма іх увагі. Нікога гэта не ўсхвалявала і ня абурыла. Загадчык дрычынскай пяцігадовай сярэдняй школы Трайчынскі, да якога Мотуз звярнуўся са скаргай, аднёсся да гэтага з бюракратычнай роўнадушнасцю. Сельскі камітэт саюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы (старшыня камітэта Каляда) абмежаваўся вынясеннем вымовы настаўніцы Васіленка, а справы настаўнікаў седчынскай школы нават не разглядаў.

Нічым іншым, як патураннем варожай рабоце, нельга назваць бестурботнасць раённага аддзела нарасветы на чале з загадчыкам Якаўлевым. Ведаючы пра выпадкі здзекаў над дзецьмі, ён не прыняў ніякіх мер. Відавочныя, устаноўленыя факты не вывелі яго з тупой добрадушнасці і спакою.

У нашай краіне, як ніхто, настаўнік акружан небывалай любоўю і клопатамі. Яму даверана самая ганаровая справа — выхаванне з нашай шчаслівай дзетвары моцнага пакалення соцыялізма. І ніякай цярплівасці не можа быць да тых, хто не апраўдвае гэтага высокага давер'я, хто імкнецца сваёй шкодніцкай работай заплямціць совецкую школу.

Мы чакаем ад Наркомасветы БССР тэрміновага ўмяшання і неабходных вываадаў.

Т. ХАДКЕВІЧ.

ЦІ ТАК ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ?

Работа заслужанага дома соцкультуры зводзіцца толькі да таго, што ў ім дэманструюцца 10—12 разоў у месяц кінакарціны. Не глядзячы на тое, што памяшканне дома добрае, у ім ніякай масавай работы не праводзіцца. Зараз у ім холадна, а загадчыка тав. Ключніка гэта не турбуе.

Райвыканком адпусціў 18 тысяч рублёў для набыцця падвойнай кіноапаратуры, але яна не набыта і сродкі могуць застацца нескарыстанымі. Гэта таксама не турбуе загадчыка дома.

Тав. Ключнік не цікавіцца арганізаванай самадзейнасці. А людзі, якія хочуць прымаць удзел у гуртках самадзейнасці, ёсць. Вось таленавітыя выканаўцы песень Арлоўская Ліда, Кагановіч Бася, Сасінаўская М., або работы Мазуркевіч, Манкевіч, Каляровіч, — яны могуць удзельнічаць у драмгуртку. Адзінае, што зрабіў «добрае» т. Ключнік—гэта купіў настольныя більярды і ўстанавіў плату за ігру — у гадзіну 1 руб. Гэта «разумнае» мерапрыемства ўхвалена райана.

Прыходзіцца, відаць, чакаць нам, моладзі, што хутка загадчык дома знойдзе патрэбным браць грошы яшчэ за ігру ў шашкі і даміно(!?).

Заслужаному райвыканкому трэба ліквідаваць метады халтурщчыны і даць моладзі магчымасць культурна і разумна адпачываць.

Б. НОТКІН.

УДЗЕЛ БССР У ДЭКАДЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ

Белдзяржкіно атрымала запрашэнне прыняць удзел у дэкадзе нацыянальнай кінематаграфіі ў Маскве. Беларуская кінематаграфія адабрала для паказу свае лепшыя карціны. Адпраўлены ў Маскву для папярэдняга прагляду ў адборачнай камісіі 6 мастацкіх гукавых фільмаў, выпушчаных кіностудыяй «Совецкая Беларусь», у тым ліку: «Шукальнікі шчасця», «Канцэрт Бетховена» і іншыя.

Дэкада нацыянальнай кінематаграфіі будзе праведзена ў Маскве ў сакавіку і з'явіцца падрыхтоўкай да другога ўсесаюзнага кінофестываля, які намечан у Маскве на восень бягучага года. Да ўдзелу ў дэкадзе прыцягваюцца ўсе нацыянальныя кіностудыі Саюза. Кіргізія і Казахстан, якія не маюць кіностудый, будуць прадстаўлены хранікальнымі фільмамі, малюючымі соцыялістычную сапраўднасць гэтых рэспублік.

У якасці гасцей запрашаюцца звыш 100 работнікаў нацыянальнай кінематаграфіі — рэжысёраў, аператараў, акцёраў, работнікаў культурнага фронта і т. д. У кожным сеансе будуць паказвацца два фільмы розных рэспублік. Усяго ў часе дэкады намечана прадэманстраваць звыш 20 фільмаў.

Пасля ітогавага вечара адбудзецца вялікі канцэрт з удзелам артыстаў саюзных рэспублік.

У журы дэкады ўваходзяць сакратар Совета нацыянальнасцей ЦВК Саюза ССР т. А. Хацкевіч (старшыня), начальнік Дзяржаўнага кіраўніцтва кінематаграфіі т. Б. Шумяцкі і іншыя.

ТВОРЫ ШЭКСПІРА НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдала на яўрэйскай мове рад буйнейшых твораў Шэкспіра. Ужо выпушчаны «Гамлет», «Юлі Цэзар», «Отэло», «Рамэо і Джульета», «Рычард III» і інш. агульным тыражом да 20 тыс. экземпляраў. Пераклад па яўрэйскую мову зроблен з англійскага камбрыджскага выдання. У бягучым годзе выйдзе з друку «Лэдзі Макбет».

Не падрыхтаваліся да рамонту трактароў

Дырэкцыю Смальянскай МТС (Аршанскі раён) рамонт трактароў захапіў знянацку. У майстэрні, дзе адбываецца рамонт, нехапае варштатаў, у памяшканні вельмі халодна. Старшы механік Баборык ніколі не заходзіць у майстэрню.

З трактарыстамі яшчэ не разлічыліся за мінулы год. На запытанне трактарыстаў, калі будзе разлік, галоўны бухгалтар Шырко адказвае: «Вам зімою рабіць няма чаго, хадзіце ў кантору, калі будуць грошы, тады і атрымаеце».

Сярод трактарыстаў ніякай культурна-масавай работы не праводзіцца. Памочнік па палітчасці Бунім за ўвесь час не быў ні ў адной з трактарных брыгад.

ТРАКТАРЫСТ.

МЫ СМЕЛА ІДЗЕМ ДА КОМУНІЗМА

(З выступлення на Надзвычайным XII З'ездзе Советаў БССР)

І. СУРТА

Прэзідэнт Акадэміі навук БССР.

Напісаная рукою вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна Сталінская Канстытуцыя з'яўляецца велізарным дакументам нашай эпохі, велізарным дакументам у развіцці рабочага руху не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце.

Гэты дакумент можна параўнаць толькі з такімі вялікімі творамі чалавечай мыслі, якім з'яўляецца «Маніфест комуністычнай партыі», напісаны Марксам і Энгельсам і такім велізарнейшым творам, якім з'яўляецца «Дзяржава і рэволюцыя», напісаны Уладзімірам Ільічом Леніным.

Велізарнай заслугай таварыша Сталіна, як тэарэтыка, з'яўляецца распрацоўка ім Канстытуцыі, у якой ён на аснове марксізма-ленінізма адлюстроўвае жыццё соцыялістычнай дзяржавы, узняўшы самую тэорыю марксізма-ленінізма тым самым на недасягальную вышыню.

У сваім дакладзе аб Канстытуцыі і ў самой Канстытуцыі таварыш Сталін паставіў па-новаму рад пытанняў, развіўшы іх у буйнейшыя пытанні марксізма-ленінізма. У Сталінскай Канстытуцыі дан новы закон устройства совецкай дзяржавы, як дзяржавы соцыялістычнай, дан закон дзяржавы, адпавядаючай першай фазе комунізма, дана абгрунтаванне першай фазы комунізма. Тым самым паказан шлях, якім комунізм ад першай фазы соцыялізма будзе развівацца далей.

У буржуазных краінах — канстытуцыі з'яўляюцца законамі дзяржаў капіталістаў і памешчыкаў; у нас — Канстытуцыя з'яўляецца законам соцыялістычнай дзяржавы рабочага класа і сялянства; у іх — прыватная ўласнасць на зямлю, фабрыкі і заводы, як крыніца нажывы багацеяў; у нас — грамадская соцыялістычная ўласнасць свяшчэнна і недатыкальна, як аснова соцыялістычнага ладу, як крыніца заможнага і культурнага жыцця працоўных; у іх — прыгнячанне і эксплаатацыя працоўнага народу капіталістамі, памешчыкамі, кулакамі, папамі і інш.; у нас — няма прыгнячання, няма эксплаатацыі, няма эксплаатарскіх класаў; у іх — беспрацоўе, жабрацтва і голад; у нас — няма беспрацоўя, у нас усе працоўныя маюць права на працу, на адпачынак, на забеспячэнне ў старасці і ў выпадку хваробы і страты працаздольнасці; у іх — палова насельніцтва — жанчыны — беспрацоўныя, у нас жанчыны — вялікая сталінская сіла ў будаўніцтве соцыялістычнай дзяржавы; у іх — юнацтва пазбаўлена права выбараў: ва Францыі, у Амерыцы і інш. дзяржавах неабходна мець 30—40-гадовы ўзрост, каб мець выбарчыя правы. Такім чынам у іх усё юнацтва пазбаўлена права ўдзелу ў кіраванні дзяржавай, у грамадскім жыцці. У нас — уся моладзь ад 18 год абіраецца і абірае ў органы кіраўніцтва дзяржавай. У іх — не абіраюць цэлыя нацыі, а таксама беспрацоўныя рабочыя, батракі, ваенныя і немаземныя; у нас — абіраюць усе працоўныя, прычым усякая пропаведзь расавай выключнасці і нянавісці караецца законам.

Таму Сталінская Канстытуцыя з'яўляецца для рабочых і сялянскіх мас капіталістычных краін праграмай іх барацьбы з эксплаататарамі, і мы цвёрда верым, што пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна працоўныя капіталістычных краін звергнуць капіталізм на ўсім свеце.

Таварыш Сталін ужо ў сваіх першых творах указваў на неабходнасць аб'яднання ўсіх нацыянальных рэспублік у вялікі калектыў совецкіх дзяржаў — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, як на адзіны шлях выратавання ад нацыянальнага прыгнечання.

«...Ізаляванае існаванне асобных совецкіх рэспублік няўстойліва, нятрывала з прычыны пагрозы іх існаванню з боку капіталістычных дзяржаў. Агульныя інтарэсы абароны совецкіх рэспублік, з аднаго боку, аднаўленне зруйнаваных вайной вытворчых сіл, з другога боку, і неабходная харчовая дапамога няхлебным совецкім рэспублікам з боку хлебных, з трэцяга боку, — загадна дыктуюць дзяржаўны саюз асобных совецкіх рэспублік, як адзіны шлях выратавання ад імперыялістычнай кабалы і нацыянальнага гнёту. Вызваліўшыяся ад «сваёй» і «чужой» буржуазіі нацыянальныя совецкія рэспублікі могуць адстаяць сваё існаванне і перамагчы злучаныя сілы імперыялізма толькі аб'яднаўшыся ў цесны дзяржаўны саюз, або яны зусім не перамогуць». (І. Сталін — «Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне» — «Аб чарговых задачах партыі ў нац. пытанні», стар. 68—69).

Гэтыя геніяльныя ўказанні таварыша Сталіна апраўданы жыццём.

У сваім дакладзе Надзвычайнаму VIII З'езду Советаў СССР аб праекце Канстытуцыі таварыш Сталін дапоўніў свае ранейшыя палажэнні па гэтаму пытанню:

«Прайшоўшы перыяд, — сказаў таварыш Сталін, — з несумненнасцю паказаў, што вопыт стварэння многанацыянальнай дзяржавы, створанай на базе соцыялізма, удаўся поўнасцю. Гэта ёсць несумненная перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі»...

«З рэзультаце мы маем цяпер цалкам склаўшуюся і вытрымаўшую ўсе іспыты многанацыянальную соцыялістычную дзяржаву, моцнасці якой магла-б пазайздросціць усякая нацыянальная дзяржава ва ўсякай частцы свету».

Усяму свету вядома, што робіць фашызм з дзяржаўнасцю, дэмакратызмам, культурай, школай і т. д. Прыкладамі гэтых варварскіх адносін да культуры мінулага з'яўляюцца фашысцкая Германія, Польшча і інш. Германскі фашызм ліквідаваў культуру германскага народу, растаптаў яе ботамі штурмавікоў, спаліў, як палілі сярэдневяковыя інквізітары, яе лепшыя творы.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі ў нас бурна расце наша соцыялістычная культура. Як яе ўстановы, так і работнікі культуры, навукі, мастацтва, літаратуры ў нас карыстаюцца выключнай павагай, велізарнай матэрыяльнай дапамогай з боку нашай дзяржавы.

Наша партыя яшчэ на зары сваёй гісторыі запісала ў сваю праграму патрабаванні бясплатнай агульнай асветы для дзяцей усіх працоўных абодвух полаў. Зараз гэта праграма, маючая велізарнае культурнае значэнне, ажыццяўляецца ў Канстытуцыі Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, у Канстытуцыі нашай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Грамадзяне СССР маюць права на асвету, і гэта права забяспечваецца агульнай пачатковай асветай, сярэдняй асветай, бясплатнай асветай, уключаючы вышэйшую, сістэмай дзяржаўных стыпендый і т. д.

Створаны ўсе ўмовы для развіцця культуры соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме. Нябачана растуць наша навука, наша культура. Гэта характарызуецца ў апошнія часы тым, як наша краіна святкавала юбілей геніяльнага паэта вялікага рускага народу Аляксандра Сергеевіча Пушкіна. Не было горада і сяла, не было прадпрыемства, калгаса і ўстановы, дзе-б не праводзілася гэта свята, як выражэнне вялікай дружбы паміж усімі народамі Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Гэта свята выражала любоў усіх народаў да вялікага рускага народу, гарачую любоў да сваёй памяці, да свайго любімага правадыра таварыша Сталіна.

Контрэволюцыйныя нацдэмы, агенты польскага і нямецкага фашызма ненавідзелі культуру брацкага рускага народу. Яны імкнуліся пазбавіць беларускі народ сонечнай паэзіі рускага народу, яго навукі, яго культуры.

Партыя большэвікоў Беларусі, разбіўшы нацдэмаўскую контрэволюцыю, расчысціла шляхі беларускай культуры да культуры вялікага рускага народу.

Мы павінны пвёрда памятаць, што толькі ў выніку і пасля разгрому нацдэмаў беларускаму народу сталі даступны «Пушкін і Гейне, Рустарэлі і Горкі, Бальзак і Талстой» (з'пісьма беларускага народу вялікаму Сталіну).

Вялікі рускі народ і яго культура служаць крыніцай пастаяннай дапамогі ў развіцці культуры іншых народаў, у тым ліку — культуры народаў Совецкай Беларусі. «Руская культура ўзбагачае культуру іншых народаў, руская мова стала мовай сусветнай рэволюцыі, на рускай мове пісаў Ленін, на рускай мове піша Сталін. Руская культура стала інтэрнацыянальнай, бо яна самая перадавая, самая чалавечная, самая гуманная. Ленінізм — яе дзецішча. Сталінская Канстытуцыя — яе выражэнне! («Правда», 16 студзеня 1937 года).

Соцыялізм запвердзіў сябе, як насляДоўна ўсёй перадавой сусветнай культуры і ў пушкінскіх святах паказвае, на якую невымяральную вышыню з любоўю і гонасцю ўзнімае ён чалавека, чалавечы талент.

Заклятыя ворагі народу беларускія нацыяналісты, контрэволюцыйныя нацдэмы, бундаўцы, агенты азвярэлага фашызма — трацкісты і інш. прабавалі на ўсім працягу барацьбы з партыяй Леніна—Сталіна, барацьбы з прапоўным беларускім народам зрываць наша соцыялістычнае будаўніцтва, рэстаўраваць капіталізм, аднавіць уладу памешчыкаў і капіталістаў, прадаць беларускі народ і яго дзяржаву польскаму германскаму фашызму.

Ужо ў 1917 годзе беларускія нацдэмы ўказвалі, што «з большэвікамі трэба змагацца, бо соцыялізм рыхтуецца завесці ў дзяржаве такі грамадскі лад, да якога людзі не дараслі»[1]). Бундаўцы ў сваім «Арбейтар штымэ» ў гэты перыяд указвалі, што «Расія толькі зараз выступае на шлях шырокага капіталістычнага развіцця»[2]). Як бачым, установкі контрэволюцыйных нацдэмаў, бундаўцаў і тады і пазней нічым не адрозніваліся ад установак контрэволюцыйных трацкістаў сёнешняга дня. Контрэволюцыя змяняла формы і метады барацьбы з намі, але не праграму. Аснова гэтай праграмы — рэстаўрацыя капіталізма — асталася адной і той-жа і на сёння. Але гэта праграма разбіта жыццём, разбіта комуністычнай партыяй.

У Сталінскай Канстытуцыі абвяшчаюцца соцыялістычныя прынцыпы: «хто не працуе, той не есць», «ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы».

Гэтыя соцыялістычныя прынцыпы сведчаць аб канчатковай і бесваротнай перамозе соцыялізма ў СССР, соцыялізма ў нашай Совецкай Беларусі. Гэты, ажыццёўлены на справе, соцыялістычны прынцып наносіць канчатковае паражэнне ўсім рэстаўратарам капіталізма — нацдэмаўскай, трацкісцкай і інш. контрэволюцыі.

Фашысцкія шпіёны, дыверсанты і бандыты з вялікай дарогі — трацкісцкая зграя — злоўлена на месцы выканання сваіх крывавых спраў і раздаўлена прыгаворам 170-мільённага народу.

Мы ўзнімем яшчэ вышэй рэволюцыйную пільнасць, яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол ленінска-сталінскай партыі, каб не даць ворагу, не даць контрэволюцыйнай сволачы пралезці ні на адзін з участкаў соцыялістычнага будаўніцтва нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Соцыялізм узнімаецца над зямлёй, як новае сонца, і пад яго праменнямі, натхнёныя яго сілай пачынаюць гучаць словы і песні ўсяго працоўнага чалавецтва, новыя песні, якія раней за ўсіх народаў спяваюць народы Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Мы смела ідзем да комунізма!

Няхай жыве правадыр сусветнага комунізма — вялікі Сталін!

[1]) «Вольная Беларусь» № 30.
[2]) № 15. май 1917 г.

ОРДЖАНІКІДЗЕНСКІ ЗАКЛІК СТАХАНАЎЦАЎ І ЎДАРНІКАЎ

Стаханаўскай работай увекавечым памяць Серго

Стаханаўцы, ударнікі, рабочыя, і інжынерна-тэхнічныя работнікі абутковай фабрыкі імя Тэльмана (Менск) на сваім сходзе аднагалосна віталі прапанову лепшых людзей вугальнай і металургічнай прамысловасці Данбаса аб абвяшчэнні орджанікідзенскага закліку ў рады стаханаўцаў і ўдарнікаў.

Калектыў абутковай фабрыкі імя Тэльмана, уключаючыся ў орджанікідзенскі заклік, узяў на сябе абавязацельствы:

у 1937 годзе выпусціць на 167,6 проц. больш абутку супроць 1936 года, строга захоўваючы пры гэтым асартымент. Сакавіцкі план рабочыя абавязаліся выканаць на два дні раней тэрміну, а поўгадавы — на 10 дзён раней. Апрача таго, рабочыя ўзялі на сябе абавязацельствы па паляпшэнню якасці прадукцыі, эканоміі дэфіцытных скурматэрыялаў і росту колькасці стаханаўцаў і ўдарнікаў.

Шэфства стаханаўцаў над адстаючымі

ВІЦЕБСК (па тэлефону). З вялікім патхненнем сустрэў васьмітысячны калектыў панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» заклік данбасаўцаў.

Лепшыя стаханаўкі адказваюць на заклік узяццем шэфства над адстаючымі работніцамі. Стаханаўка матальнага цэха Катовіч дапамагла асвоіць тэхнічныя нормы работніцы Мощкай. Зараз яна ўзяла шэфства над работніцамі Градоўкінай і Мішчанка.

Стаханаўка вязальнага цэха Цыкунова стала на стаханаўскую варту імя Орджанікідзе і дае штодзённа 760—770 ізесяткаў панчох, замест нормы ў 708.

Брыгадзір швейна-бялізнавага цэха Радкевіч ад імя брыгады ўзяла абавязацельства ператварыць да 1 мая брыгаду ў суцэльна стаханаўскую. Брыгада штодзенна ўжо дае 300 сарочак замест 180 па норме.

Работніцы швейна-кепельнага цэха Рубінштэйн, Старавойтава, Шыфрына, якія не выконвалі да гэтага часу свае нормы, зараз пры дапамозе стаханавак Гольман і Гузарэнка даюць па 110 — 115 проц.

Цагельнікі БССР, арганізуем орджанікідзенскі заклік стаханаўцаў і ўдарнікаў

Рабочы калектыў 3-га цагельнага завода (г. Менск) аналушна ўхваліў прапанову данбасаўцаў аб арганізацыі орджанікідзенскага закліку стаханаўцаў і ўдарнікаў.

Інжынерна-тэхнічныя работнікі, стаханаўцы і ўдарнікі цагельнага завода № 3 абавязаліся датэрмінова выканаць вытворчы план завода: план першага квартала — да 20 сакавіка, гадавы — да 20 галавіны Кастрычніцкай рэволюцыі і звярнуліся з пісьмом да ўсіх рабочых, работніц і інжынерна-тэхнічных работнікаў цагельнай прамысловасці БССР, у якім прапануюць арганізаваць новы ўздым стаханаўскага руху, сацыялістычнага спаборніцтва, каб забяспечыць датэрміновае выкананне задання ПК КП(б)Б — даць у 1937 г. будоўлям краіны 620 мільёнаў штук цэглін.

— Усе камандзіры, усе спецыялісты,— гаворыцца ў пісьме рабочых цагельні № 3, — павінны сапраўды на справе ўзначаліць стаханаўскі рух і сацыялістычнае спаборніцтва. Вопыт стаханаўцаў павінен стаць здабыткам усіх рабочых. На кожным участку, на кожнай печы павінны быць устаноўлены канкрэтныя заданні і тэрміны выканання іх, прычым радам арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў павінна быць забяспечана дакладнае выкананне заданняў.

— Доўг партыйных і непартыйных інжынераў, тэхнікаў, стаханаўцаў, ударнікаў і ўсіх рабочых, — гаворыцца далей у пісьме, — яшчэ мацнейшай згуртавацца вакол партыі Леніна—Сталіна, да канца ліквідаваць астаткі подлых здраднікаў радзімы, рэстаўратараў капіталізма, агентаў фашызма — трацкістаў і зіноўеўцаў і іх саюзнікаў — правых адшчапенцаў.

— Мы, рабочы калектыў цагельнага завода № 3, — заканчваецца пісьмо, — ушаноўваючы слаўную памяць нашага любімага Серго, становімся на стаханаўскую вахту яго імя, абвяшчаем орджанікідзенскі заклік камандзіраў і рабочых у рады стаханаўцаў і ўдарнікаў. Мы выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва менскі цагельны завод № 1. Заклікаем усіх камандзіраў і рабочых цагельнай прамысловасці БССР справай падтрымаць нашу прапанову.

АДДАМ ЖЫЦЦЁ ЗА СВАЮ ЛЮБІМУЮ РАДЗІМУ

Я — сын беларускага селяніна-бедняка. У сям'і майго бацькі было 9 душ. Чатыры дзесяціны зямлі-няўдобіцы, раскіданай вузкімі палоскамі, не маглі пракарміць 9 ртоў. Хлеба заўсёды не хапала. Мяне і брата ва ўзросце 12 год аддалі служыць кулакам, якія нас бязлітасна эксплаатавалі.

На кулакоў мы працавалі да таго часу, пакуль наш любімы настаўнік і друг таварыш Сталін не выступіў са сваім гістарычным лозунгам аб арганізацыі калгасаў і ліквідацыі кулацтва як класа.

Мой бацька з усёй сваёй сям'ёй уступіў у калгас з першага-ж дня яго арганізацыі.

Толькі ў калгасе я і ўся мая сям'я ўпершыню ўбачылі шчаслівае, радаснае жыццё. У калгасе я прапрацаваў 6 гадоў, спачатку я быў па палявых работах. Калі праўленне ўпэўнілася, што я працую шчыра, аддана і старанна, мяне паслалі на курсы жывёлаводаў. Па сканчэнні курсаў я атрымаў годнасць тэхніка-жывёлавода. Калі я вярнуўся ў свой родны калгас, праўленне вызначыла мяне на адказную і пачэсную работу — загадчыкам жывёлагадоўчай фермы.

Я заўсёды імкнуўся апраўдаць давер'е, якое аказалі мне праўленне і калгаснікі. Я любіў сваю работу і перамагаў усе цяжкасці і перашкоды.

Зараз я знаходжуся ў радах Чырвонай Арміі і абараняю краіну Советаў.

Калі вораг пасмее пераступіць нашы граніцы, я аддам сваё жыццё і да апошняй кроплі крыві буду абараняць сваю любімую радзіму.

Даю шчырае пролетарскае слова, што за два гады прабывання ў радах Чырвонай Арміі я аўладаю ваеннай тэхнікай на «выдатна».

Выклікаю ўсіх сваіх таварышоў, маладых байцоў прызыву 1936 г. таксама на выдатна аўладаць усёй ваеннай тэхнікай і ўсімі сіламі абараняць ад ворагаў нашу шчаслівую краіну, любімую радзіму.

Дзякую партыі і таварышу Сталіну за шчаслівае, радаснае жыццё ў калгасе і за тое, што выхавалі з мяне свядомага грамадзяніна і байца.

Чырвонаармеец І. М. МІЛЬТО.

НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАГА ТЫРАЖУ НОВАЙ ПАЗЫКІ

1 ліпеня 1936 года ўрад выпусціў пазыку на 4 мільярды рублёў. Ужо за першыя пяць дзён пасля апублікавання дэкрэта, пазыка была размешчана на 3 мільярды 470 мільёнаў рублёў, а к канцу наступнай затым пяцідзённі сума рэалізацыі дасягнула 4 мільярдаў 228 мільёнаў рублёў. У гэтым выказалася воля народу дапамагчы сваёй дзяржаве, а таксама і прызнанне таго факту, што змяшчэнне грошай у пазыку з'яўляецца найбольш даходным прылажэннем ашчадных сродкаў. І сапраўды, калі па ўкладах у банк дзяржава ўплачвае паўтары процанты, а па ўкладах у ашчадныя касы тры процанты, то па пазыцы ўплачваецца 4 процанты ў год. Аблігацыя, значыцца, з'яўляецца каштоўнай паперай і самым даходным змяшчэннем зберажэнняў працоўных. У сувязі са зніжэннем пэн, каштоўнасць аблігацыі ўсё больш павышаецца. Гэта пацвярджаецца данымі аб умацаванні рубля і зніжэнні пэн. Калі ў 1934 годзе кілаграм жытняга хлеба каштаваў 2 рублі, то цяпер ён каштуе 85 капеек, калі кілаграм масла каштаваў 25—30 рублёў, цяпер яно каштуе 15—18 рублёў, цукар у 1934 годзе каштаваў 12—15 рублёў, зараз ён каштуе 3 р. 80 к. — 4 р. 10 к. За адзін толькі 1935 год насельніцтва зэканоміла на зніжэнні пэн каля 5 мільярдаў рублёў.

Урад, прымаючы закон аб выпуску новай пазыкі і абмене старых пазык на новую, адмяніў стары парадак залога аблігацый. Раней аблігацыі дазваляліся закладваць толькі па асобнаму дазволу камісіі саўдзейнасці дзяржкредыту, цяпер дазваляецца залог аблігацый кожнаму грамадзяніну, калі ён захоча і ў любой суме. Аднак, трэба падкрэсліць, што закладзеная аблігацыя абязлічваецца і не прымае ўдзелу ў тыражах пазыкі. Значыцца, калі пазыкатрымальнік заклаў сваю аблігацыю перад тыражом пазыкі, то ён тым самым страціў ужо права на даход ад пазыкі або на выйгрыш па сваёй аблігацыі.

25 мая адбудзецца тыраж новай пазыкі. У гэтым тыражы будуць разыграны 5.000 выйгрышаў на суму 824.600 рублёў, ў тым ліку адзін выйграш у 3.000 рублёў, 5 — па 1.000 рублёў, 50 — па 500 рублёў, 1.000 — па 200 рублёў і 3.944 білеты па 150 рублёў.

Камісія саўдзейнасці дзяржаўнаму крэдыту павінны растлумачыць пазыкатрымальнікам умовы падыходзячага тыража пазыкі, каб аблегчыць ім магчымасць удзелу ў розыгрышы даходу.

Камісія саўдзейнасці павінны кожнаму пазыкатрымальніку, заклаўшаму сваю аблігацыю, растлумачыць, што калі да наступлення тыража ён не выкупіць свайго залога, то страціць права на ўдзел у розыгрышы тыража.

С. Г.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ФІНАНСАВЫХ РАБОТНІКАЎ

У 1936 годзе БССР выканала план дзяржаўных даходаў з перавышэннем на 28 мільёнаў. Заданне І квартала 1937 г. да 10 студзеня рэалізавана на 47,2 проц. Аднак, разам з гэтымі поспехамі ў рабоце фінорганаў Беларусі па дзярждаходах ёсць яшчэ многа буйных недахопаў: выпадкі няправільнага прымянення падатковых ставак, спазненне з правяркай падатковых справаздач, ліберальныя адносіны да нядзімшчыкаў, недастатковыя культурныя адносіны з дакументамі, нездавальняючае вядзенне складанага рахункаводства ў асобных раёнах.

Нядаўна ў Менску адбылася нарада інспектароў-рэвізораў і бухгалтароў па дзяржаўных даходах БССР. У адзнаку зацвярджэння Сталінскай Канстытуцыі нарада ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў на 1937 год, у прыватнасці: выканаць поўнасцю план дзяржаўных даходаў 1937 г. па ўсіх раёнах Беларускай ССР; поўнасцю ліквідаваць нядоімкі падатку з абароту ва ўсіх раёнах рэспублікі, дабіцца таго, каб плацяжныя даручэнні на пералічэнне падаткаў даваліся дзяржорганамі своечасова; забяспечыць стопроцантнае прадстаўленне ў тэрмін падатковых справаздач і ўсебакова правяраць іх. Праверку справаздач скончыць: за 1936 г.— да 25 красавіка 1937 года; бягучых месячных па рашаючых прадпрыемствах не пазней чым праз 15 дзён, а квартальных — праз месяц пасля тэрміна іх прадстаўлення ў фінорганы; сістэматычна кантраляваць выкананне гандлёвымі арганізацыямі ўстаноўленых для іх планаў тавараабароту; штодзенна правяраць работу збытавых баз прамысловасці і сістэматычна сачыць — з дапамогай грамадскіх інспектароў, фінансавых секцый саветаў— за насычанасцю гандлёвай сеткі ўсімі неабходнымі таварамі: арганізаваць і працесці на «выдатна» балансавую кампанію бягучага года. Дабіцца, каб рэзультаты гаспадарчага года былі абмяркованы на агульных сходах рабочых і служачых рашаючых прадпрыемстваў і пайнікаў калегіяльна з абавязковым садакладам інспектара дзярждаходаў, аналізаваўшага справаздачы і баланс даной арганізацыі; не дапускаць ні аднаго выпадку ўхілення ад падатковай рэгістрацыі.

Нарада звярнулася з заклікам да ўсіх работнікаў дзяржаўных даходаў Саюза ССР разгарнуць барацьбу за выкананне і перавыкананне плана дзяржаўных даходаў 1937 г., за павышэнне якасці работы, за далейшае ўмацаванне совецкага рубля і рост сацыялістычнай уласнасці — крыніцы заможнага і культурнага жыцця працоўных Совецкага Саюза.

НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ ЛЕСАЗАГАТОЎКІ

(Па пісьмах у рэдакцыю)

Пасля абвяшчэння ПК КП(б)Б і СНК БССР месячніка па лесазагатоўках і вывазках мала што змянілася ў Чэрвеньскім раёне. Леспрамгас па-ранейшаму адстае.

Мы атрымалі рад пісем з Чэрвеня, дзе паведамляюць, што сельсоветы: Горкаўскі (старшыня Чапкевіч), Калодзежскі (старшыня Грынкевіч), Ледзянскі (Кожух), Хутарскі (Крылоў) правальваюць лесазагатоўкі.

Некаторыя раённыя арганізацыі (райкамбінат, інвалідны дом, саматужныя арцелі), як піша нам т. Шут, падрываюць работу леспрамгаса, самастойна павышаючы цэны за вывазку. Раённы пракурор т. Шчукін не звяртае ўвагі на такія антыдзяржаўныя дзеянні.

Ёсць у раёне і німала стаханаўцаў лесу. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Самалёт» Кудзін Рыгор, Зяргейчык Алесь, Андрончык Гаўрыла і інш. перавыконваюць свае нормы па вывазцы ў два разы. Такія прыклады ёсць і ў іншых калгасах. Але-ж уся бяда ў тым, што работнікі леспрамгаса не ўзначаліі стаханаўскі рух у лесе, а іншы раз і самі падрываюць яго.

У радзе месц раённыя арганізацыі не займаюцца лесазагатоўкамі. Рабочнік рочыцкага леспрамгаса т. Гінзбург піша нам з Жлобіна, што старшыня райвыканкома т. Людзько, з'яўляючыся ўпаўнаважаным СНК БССР па раёну па загатоўцы і вывазцы лесу, сам нічога не робіць, а ўсклаў гэту работу на сельсоветы.

За апошнюю дэкаду ў раёне загатоўлена ўсяго 0,3 проц. плана, вывезена 0,8 проц. плана. Што можа быць больш ганебным для раённых кіраўнікоў?

Творчасць Юрыя Майсеевіча Пэна

Часаўшчык

Комсамолец

Субота

ЛЯСНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БССР У 1937 ГОДЗЕ

І. РУДАКОЎ

Народны камісар лясной прамысловасці БССР

У 1937 стаханаўскім годзе перад новаарганізаваным Наркаматам і ўсімі работнікамі лясной прамысловасці БССР стаць рад важнейшых задач. Пастановай Совета Народных Камісараў СССР і ЦК ВКП(б) каля 30 проц. лясоў БССР пераведзены на становішча забароненых, а астатнія 70 проц. — на становішча водазахаваўчай зоны.

Тэму лясная прамысловасць БССР павінна пакончыць з той бессістэмнай рубкай лесу, якая была да гэтага часу, перабудаваць сваю работу ў напрамку правільнага выкарыстання лясных багаццяў рэспублікі шляхам роўнамернай і карыснай эксплаатацыі іх у рамках гадавога прыросту. Пры правільным вядзенні лясной гаспадаркі з боку поваарганізаванага лесаабароннага кіраўніцтва гэты штогодні прырост лясоў у БССР можа быць значна паднят.

У адпаведнасці са зробленым адводам лесасек, лесазагатоўкі і вывазкі ў 1937 годзе скарачаюцца ў параўнанні з 1936 годам прыкладна на 30 проц. Адсюль адна з асноўных задач лесазагатоўшчыкаў: пры распрацоўцы лясных дзялянак узяць максімум драўніны ад масы, забяспечыць правільную распрацоўку гэтай драўніны на лесасецы, забяспечыўшы максімальны выхад дзелавой драўніны, годнай для перапрацоўкі на дрэваапрацоўчых прадпрыемствах і для будаўніцтва. Дрэваапрацоўчым прадпрыемствам (фанэрным, мэблевым, лесапільным, запалкавым і інш.) трэба распрацоўваць атрымліваемую ад лесазагатовак сыравіну, каб атрымаць з яе максімальны выхад вырабаў.

Як па лініі лесазагатовак, так і па перапрацоўцы драўніны на прадпрыемствах мы маем велізарныя рэзервы. Калі за ўсе мінулыя гады выхад дзелавой драўніны пры загатоўцы на лесасецы вызначаўся ў 52—54 проц., а астатняя частка нарыхтоўвалася, як дровы, то мы павінны паставіць сабе задачу ў 1937 годзе даць выхад дзелавой драўніны не менш 65—67 проц.

Найбольш вялікі процант (ад 23 да 38) выхаду дзелавой драўніны давалі лісцяныя і цвёрда-лісцяныя пароды (бяроза, дуб і інш.). У сярэднім па ўсіх лісцяных пародах выхад дзелавой драўніны складаў 30 проц. Мірыцца з такімі паказальнікамі выхаду дзелавой драўніны мы не можам, бо мы гэтым ставім пад пагрозу астаноўкі нашы дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы з-за недахвату сыравіны. Прычым, трэба ўлічыць, што пры павелічэнні выхаду якасных асартыментаў, несумненна, значна павысіцца рэнтабельнасць лесазагатовак, бо кубаметр дзелавой драўніны, асабліва лісцяной пароды, прыкладна ў 3 разы даражэй дроў. Павелічэнне-ж прыбытковасці леспрамгасаў і лесапунктаў дасць магчымасць пакончыць з такімі агідна злачынными з'явішчамі, як несвоечасовая выплата заработнай платы рабочым, лесазагатоўшчыкам і возчыкам і дазволіць дырэктару леспрамгаса і лесапункта, за кошт так званых дырэктарскіх сум, падняць на неабходны ўзровень бытавое і культурнае абслугоўванне рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, занятых на лесазагатоўках. Краіна атрымае прырост прадметаў шырокага спажывання і будматэрыялаў.

Для таго, каб практычна вырашыць задачу якаснай падрыхтоўкі сыравіны, неабходна паляпшыць ролю майстра на лесазагатоўках. Майстар павінен стаць сапраўды арганізатарам вытворчасці і рацыянальнай распрацоўкі драўніны на лесавывазцы; яго неабходна вызваліць ад розных пісаніны і бегатні па даручэннях. Кожнага майстра на лесазагатоўках, брыгадзіра і раскражоўшчыка трэба забяспечыць прэйскурантам апускных пэн на драўніну, тэхнічнымі ўмовамі па загатоўцы тых або іншых асартыментаў лесасыравіны, а таксама даведнікам па планаваму сабекошту. У прыватнасці, трэба ўстанавіць, як правіла, што фанерныя, запалкавыя, ступічныя, калодачныя і іншыя кражы загатоўваюцца не толькі доўгія, але і аднакратнай і двухкратнай даўжыні. Засваенне гэтага правіла павінна даць павелічэнне выхаду ўказанай драўніны не менш чым на 10—15 проц. Побач з гэтым трэба павялічыць за кошт дроў выпуск падсечачнай драўніны, тарніку, гонты, фрызы, клёпкі і інш., а для таго, каб не паменшыць колькасці дроў, іх трэба нарыхтоўваць па таўшчыні не ад 6—8 сантыметраў, а ад 4 сант.

У мэтах узняцця прадукцыйнасці працы лесарубаў неабходна шляхам жывога інструктажу ўсямерна ўнядрыць так званую лучковую пілу і пілу «Краскот». Як паказаў вопыт многіх стаханаўцаў-лесарубаў, авалодаўшых лучковай пілой, прадукцыйнасць працы пры рабоце з ёю павышаецца мінімум на 60 проц., а ва многіх выпадках — у 2—3 разы ў параўнанні са звычайнай двуручнай пілой. Так, напрыклад, стаханаўцы-лесарубы Любаньскага леспрамгаса тт. Шымчэня, Іван Трафімаў і Каўгарэня, Іван Раманаў, працуючы лучковай пілой, выконваюць норму загатоўкі на 203 проц. У Уздзенскім леспрамгасе тт. Кучук Іосіф Якімавіч, Дуброўскі А. загатаўляюць лучковай пілой за дзень у сярэднім 14—16 кубаметраў (170—185 проц. дзённай нормы). Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

Апрача таго, пры куставых суцэльных рубках, а таксама на распрановаўчых складах неабходна ўжыванне механічнай маторнай электрапілы. На гэтых-жа лесасеках асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на правільную арганізацыю валкі дрэва на лентачнаму спосабу, так званую «валку ў елку», што значна палегчыцьачыстку лесасекі, раскражоўку і створыць спрыяючыя ўмовы для вытворчасці трэлёвачных работ.

З увядзеннем лесаабароннай зоны мяняюцца ўмовы эксплаатацыі лесанасаджэнняў, у прыватнасці, значна павялічваецца адлегласць вывазак лесаматэрыялаў. Найбольш метазгодным відам вывазкі ва ўмовах развітых шасейных і грунтавых дарог БССР трэба прызнаць механізаваную вывазку аўтамашынамі з адпаведным прыцэпам.

Усім лесазагатоўшчыкам трэба цвёрда помніць, што вытворчую перамогу ў лесе нам дадуць лучковая піла, электрапіла, пагрузачны агрэгат, машына на вывазцы, а галоўнае — устойлівы кадр людзей, авалодаўшых тэхнікай механізацыі.

Лес трэба загатаўляць і вывозіць пры ўсякім надвор'і і ва ўсякі час года. І гэтага можна дабіцца толькі шляхам механізацыі лесавывазак. Вывазка фанерный альховай сыравіны, якая расце пераважна ў забалочаных месцах, можа быць лёгка вырашана шляхам ужывання двух барабанных лябёдак, прыстасаваных да трактара і звычайнай перасовачнай лябёдкі.

Вядучую ролю ў механізацыі лесазагатовак павінны заняць нашы інжынерна-тэхнічныя работнікі. Апіраючыся на стаханаўцаў у лесе, якіх мы налічваем сотні і тысячы, яны павінны даць рашучы бой старавяскоўай сезоннічыне з яе нізкай прадукцыйнасцю і адсталымі формамі працы.

Кіраўнікам леспрамгасаў і лесапунктаў трэба адмовіцца ад таго самацёку, які пануе ў кіраўніцтве лесазагатоўкамі. Яны павінны цвёрда засвоіць, што ўстаноўлены даяржаўны план, гэта — закон, і што гэты план трэба выканаць не толькі па колькасці, але і па якасці. Каб выканаць і перавыканаць план, неабходна ўзначаліць стаханаўскі рух, шырока разгарнуць спаборніцтва.

Галінным кіраўніцтвам і прадпрыемствам дрэваапрацоўчай прамысловасці неабходна аператыўна вырашыць задачы, звязаныя з эканомным выдаткаваннем сыравіны і выпускам добраякаснай прадукцыі.

Учотныя даныя паказваюць недапушчальна вялікія выдаткі сыравіны і рабочага часу на адзінку вырабу. Так, напрыклад, па гомельскаму камбінату пры абследванні ў лістападзе 1936 года ўстаноўлена, што пры выпрацоўцы гнутага крэсла ў мэблевым цэху толькі 8—9 проц. драўніны заключалася ў самім крэсле, а астатнія 91—92 проц. ішлі ў адыходы, прычым мёртвы адыход, г. зн. той, што не падлягае далейшаму выкарыстанню, складае не менш 40—45 проц. У калодачным цэху камбіната «Камінтарн» (Нова-Барысаў) адыход высокаякаснай бярозы складае 87 проц.

У мэтах эканоміі сыравіны (а ў гэтым закладзена і рэнтабельнасць прадпрыемстваў) неабходна пакончыць з бракам, асабліва на асобных фазах апрацоўкі, а таксама скарацць выдаткі пры раскройцы дошак для дэталей, зніжчыць непатрэбныя прыпускі для іх. Трэба ўвязаць работу лесапільных і распраўчых цэхаў у частцы выпуску неабходных дошак і загатовак для дэталей. Неабходна перайсці на шырокае фанераванне дэталей мэблі, што дасць не толькі велізарную эканомію сыравіны, але дазволіць выпускаць больш лёгкую і зграбную мэблю.

Дрэнная справа таксама з планавацапераджальным рамонтам вельмі каштоўных дрэваапрацоўчых станкоў у мэблёвых цэхах і запраўкай рэжучых інструментаў. Наогул, уся справа павінна быць узнята на больш высокую культурную ступень для таго, каб даваць насельніцтву добраякасную, прыгожую і недарагую мэблю.

Фанерным прадпрыемствам, дзе асабліва нялобра з выхадам і па гатунках, неабходна: спыніць псаванне і паніжэнне гатункованасці фанеры з-за няправільнага падбору рубашкі (верхні шпон), змяцця ад пападання смецця, змяцця кутоў, стварэння пузыроў ад неадпаведнай вытрымкі на прэсах; шырока практыкаваць рамонт шпона, не дапускаючы зрываў пры абрэзцы фанеры (у гэтых адносінах асабліва агіднае становішча на заводзе № 1 у Нова-Барысаве); увесці механічную зборку кражоў і цэнтраванне іх пры ўкладанні ў лупчыльны варштат; дабіцца змяшчання дыяметра карандаша, пераапрацоўваючы апошні на малых лупчыльных варштатах; зменшыць дыяметры Кернера не звыш 5 сантыметраў.

Па лесапіленню і дрэваапрацоўцы, у мэтах павелічэння выхаду піламатэрыялу і больш поўнага выкарыстання драўніны, трэба разгарнуць работу ўпільцэхаў па выпрацоўцы тары, скрыначнай клёпкі і прадметаў шырокага спажывання, прычым пераарыентаваць не толькі піловачныя бярвенні, але і тарнік. Па запалкавых фабрыках — перагледзець устаноўлены стандарт з мэтай павышэння якасці як саміх запалак, так і каробак. На ўсіх апрацоўчых прадпрыемствах неабходна ўдзяліць асаблівую ўвагу разгортванню ўпільцэхаў, значна пашырыўшы наменклатуру прадметаў шырокага спажывання; у прыватнасці, фанерныя заводы могуць з абрэзкаў ад кражоў арганізаваць вытворчасць дзеравяных цвікоў, а з браку—шпона ўсемагчымага роду — упаковачныя прадметы.

Усе галінныя кіраўніцтвы і Наркамлес БССР у бліжэйшы час павінны ўстанавіць жорсткія нормы выдаткавання сыравіны на адзінку вырабу для ўсёй дрэваапрацоўчай прамысловасці БССР; устанавіць рэжым і парадак вытворчасці работы кожнага прадпрыемства, выходзячы як з геаграфічнага становішча цягнеючай да іх лесазагатоўчай сыравіны, так і абсталявання самога прадпрыемства.

Велізарная колькасць поўнакаштоўнай драўніны знаходзіцца на дне беларускіх рэк. Неабходна арганізаваць па ўсіх прадпрыемствах, і не адкладаючы на доўгі час, зараз-жа вылаў гэтай драўніны.

Чарговая самая важная задача лясной прамысловасці БССР гэта — лесазагатоўкі і вывазкі. Трэст Лесбел, які ішоў увесь час наперадзе па загатоўцы і вывазцы ў сістэме Наркамлеса СССР, апынуўся ззаду многіх лесаарганізацый, і асабліва адстае па механізаванай вывазцы. За перыяд месячніка, аб'яўленага СНК БССР і ЦК КП(б)Б, трэсту Лесбел і ўсёй яго сістэме неабходна выйсці з ганебнага прарыву і заняць першае месца па Саюзу.

Правал лесавывазкі ў перыяд кароткага па Беларусі зімовага санняга шляху асуджае на арыў работу ўсіх лесаапрацоўчых прадпрыемстваў рэспублікі.

Лясная прамысловасць БССР, апіраючыся на магутны стаханаўскі рух, на сталінскіх пітомцаў — стаханаўцаў, павінна даць сапраўдныя ўзоры большэвіцкай работы і з абоза высунуцца ў перадавыя рады сацыялістычнай прамысловасці.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ІНІЦЫЯТЫВА ПОЎНАСЦЮ У РУКАХ РЭСПУБЛІКАНЦАЎ

БАІ Ў ОВІЕДО

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 2 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, на астурыйскім фронце рэспубліканцы палепшылі свае пазіцыі ў Овіедо вакол збраёвага завода, які знаходзіцца пад агнём рэспубліканцаў. Рэспубліканцы занялі таксама будынкі школы Альтаміра ў квартале Сан-Ласаро. Гэтыя будынкі маюць стратэгічнае значэнне і могуць служыць базай для далейшага наступлення ўнутр горада.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 2 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Брытыш юнайтэд прэс», урадавыя войскі ў Овіедо (Астурыя) заняілі некалькі дамоў на вуліцы Пуэрта Нуэва Альта. Занятыя пазіцыі даюць магчымасць рэспубліканцам прасунуцца яшчэ далей у горад. Урадавыя войскі пусцілі ў ход танкі, кулямёты і лынаміт, прымусіўшы мяцежнікаў у беспарадку ўцякаць.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 2 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Эспань», на мадрыдскім фронце ўзлоўж дарогі ў Пінто ўрадавым самалётам-знішчальнікам удалося кулямётным агнём знішчыць групу войск мяцежнікаў, якая накіроўвалася на мадрыдскі фронт. 2 сакавіка рэспубліканцы на мадрыдскім фронце захапілі значную колькасць германскіх кулямётаў навейшага ўзору.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 3 сакавіка. (БЕЛТА). Ва ўчарашнім вячэрнім паведамленні камітэта абароны Мадрыда гаворыцца: «Рэспубліканскія войскі прадпрынялі ў ноч на 2 сакавіка некалькі атак на лініі мяцежнікаў і захапілі важныя пазіцыі ў сектары Мадрыда. Усе атакі праціўніка былі адбіты».

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 2 сакавіка. (БЕЛТА). Буйныя сілы рэспубліканцаў кечакана перапраўліся праз раку Тахо каля Талаверы (горад на паўднёвы захад ад Мадрыда). Урадавыя войскі прасунуліся на некалькі кілометраў у напрамку Тарыхоса (за 25 клм. на паўночны захад ад Талеро) пры нязначным супраціўленні мяцежнікаў.

***

ПАРЫЖ, 3 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, учора пасля поўдня адбываўся жорсткі бой у ваколіцах вёсак Мората і Пералес дэ Тахунья ў сектары Харамы (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда). Пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі ўрадавыя войскі аўлалазі некалькімі траншэямі мяцежнікаў і ўтрымалі іх, не гледзячы на ярасную контратаку.

***

ПАРЫЖ, 3 сакавіка. (БЕЛТА). Пад артылерыйскім агнём рэспубліканскіх войск мяцежнікі аказаліся вымушанымі эвакуяваць алзін. з кварталаў Талеро (горад на поўдзень ад Мадрыда, мае важнае стратэгічнае значэнне). Рэспубліканская армія прасоўваецца паралельна рацэ Тахо. Талеро — пад прамой пагрозай урадавых войск.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 3 сакавіка. (БЕЛТА). На паўднёвым фронце рэспубліканскія войскі ўчора аднавілі прасоўванне на ўсіх сектарах Мотрыля (на ўсход ад Малагі, паміж Малагай і Альмерый), і ўвайшлі ў дотык з мяцежнікамі ў раёнах, размешчаных на ўзбярэжжы.

Урадавая артылерыя абстраляла пазіцыі праціўніка. Некаторыя з іх пакінулі мяцежнікамі і заняты рэспубліканцамі. Страты мяцежнікаў вялікія.

Англія пасылае ў Іспанію 130 кантралёраў

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 2 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, англійскае міністэрства замежных спраў аб'явіла, што кіраўніком 130 кантралёраў, пасылаемых на іспана-партугальскую граніцу, назначан капітан Макданальд, а яго намеснікам — капітан Сміт. Думаюць, што яны выедуць на месца свайго назначэння ў бліжэйшыя дні.

Група англійскіх кантралёраў складаецца з морскіх афіцэраў, матросаў і мытных чыноўнікаў.

Пытанне аб адпраўцы кантралёраў не будзе прадстаўлена на разгляд камітэта па неўмяшанню, бо гэта справа выключна датычыць пагаднення паміж Англіяй і Партугаліяй.

РЫБЕНТРОП ПАТРАБУЕ КАЛОНІЙ

БЕРЛІН (сталіца Германіі). 2 сакавіка. (Інф. «Правды»). У Лейпцыгу з вялікай прамовай выступіў германскі пасол у Лондане Рыбентроп. Яго прамова была прысвечана «праву Германіі на калоніі». На думцы Рыбентропа, ператварэнне былых германскіх калоній у мандатныя тэрыторыі азначае, што пытанне аб гэтых калоніях астаецца адкрытым. Пры гэтым ён заявіў, што «германскі народ у свой час склаў зброю, давяраючы выключна абяцанням Вільсона». (Вільсон — прэзідэнт ЗША ў часе імперыялістычнай вайны).

Па пытанню аб гіганцкім росце ўзбраенняў Рыбентроп заявіў:

«Узбраенні кожнай асобнай краіны знойдуць сваю натуральную граніцу ў размерах, намечаных для гэтага магчымасцямі і выцякаючых з геаграфічнага становішча краіны».

Гэта заява не выклікае ніякіх сумненняў, што фашысцкая Германія будзе і надалей узмоцнена падрыхтоўваць вайну.

Рыбентроп, зразумела, не ўпусціў выпадку пагаварыць аб «баранье з большэвізмам» і выступіў са звычайнымі для фашысцкіх лідэраў нападкамі на Совецкі Саюз.

ГАЛАДОЎКА ПРАТЭСТУ СТУДЭНТАЎ-ЯЎРЭЯЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 2 сакавіка. (БЕЛТА). 750 студэнтаў-яўрэяў Львоўскага універсітэта аб'явілі 24-гадзінную галадоўку пратэсту супроць абмежаванняў яўрэйскіх студэнтаў у вышэйшых навучальных установах Польшчы збіенняў яўрэяў-студэнтаў антысемітамі і супроць расаджвання яўрэяў-студэнтаў у аўдыторыях на асобных партах. Студэнты запеклся ў памяшканні яўрэйскага студэнцкага дома ва Львове, вывесіўшы плакаты з напісам «галадаем» і «Далоў гета ў вышэйшай школе!».

Творчасць Юрыя Майсеевіча Пэна

Сват

АРХІТЭКТУРНА-МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕННЕ ВЯЛІКАГА ТЭАТРА БССР

У Менску на пляцы імя Парыжскай комуны ўзмоцненымі тэмпамі будуецца вялікі тэатр БССР на 1.500 месц. Ужо ясна вырысоўваецца сілуэт велізарнага будынка, які з'явіцца багатым упрыгожаннем сталіцы БССР. Сцэнічная частка тэатра ўчарне гатова. Пяпер робяцца перакрыцці над галоўным фойэ.

У Беларускім кіраўніцтве па справах мастацтваў пад старшынствам т. Пасюкевіча адбылася спецыяльная нарада лепшых архітэктараў, мастакоў і скульптараў рэспублікі па пытанню аб архітэктурна-мастацкім афармленні тэатра. У рабоце нарады прынялі ўдзел прадстаўнік усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў і прыехаўшы з Ленінграда заслужаны дзеяч мастацтваў праф. Лангбард.

На замыслу аўтара праекта праф. Лангбарда фасад будынка ўпрыгожаць 4 скульптурныя групы на тэму аб сацыялістычнай працы, абароне краіны, адпачынку і народнай творчасці. Унутры тэатра асаблівая ўвага будзе аддана аздобленню глядзельнай залы і вялікага фойэ. Для гэтай мэты афармінелі выкарыстаюць каштоўныя парэды дрэва, штучны і натуральны мармур. Беларускі арнамент, жывапіс, скульптура аллюструюць дасягненні БССР у соцыялістычным будаўніцтве. Да архітэктурна-мастацкага афармлення тэатра будуць прыцягнуты лепшыя мастацкія сілы БССР.

400 НОВЫХ ПАШТОВА-ТЭЛЕФОННЫХ АДДЗЯЛЕННЯЎ

У бягучым годзе ў сельскіх мясцовасцях БССР адкрываюцца 400 новых паштова-тэлефонных аддзяленняў. 200 з іх пачнуць працаваць да 1 красавіка. Яны культурна абсталёўваюцца, забяспечваюцца стандартнай мэбляй і інш. неабходным абсталяваннем. Сельскія паштова-тэлефонныя аддзяленні будуць рабіць усе віды аперацый — прыём грашовых пераводаў, пасылак, перадачу тэлеграм і т. д. На адкрыццё новых прадпрыемстваў сувязі на вёсны асігнавана 1.335 тыс. рублёў.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ДАПАМОГА ШМАТСЯМЕЙНЫМ

У лютым Соўнарком разглядзеў 900 заяў і вызначыў дзяржаўную дапамогу шматсямейным у суме 1.855 тыс. рублёў.

З часу выдання закона рашэннямі ўрада БССР вызначана дзяржаўная дапамога шматсямейным на суму 23.959 тыс. рублёў.

ЖАНЧЫНА Ў КААПЕРАЦЫІ

У сістэме спажывецкай кааперацыі БССР 31 жанчына займаюць пасаду старшынь сельскіх спажывецкіх таварыстваў, адна — старшыня райсаюза, 100 — загадчыкаў крам і 10 жанчын працуюць дырэктарамі раймагаў і сельмагаў. Членамі праўленняў сельскіх спажывецкіх таварыстваў з'яўляюцца 1684 жанчыны.

Прэзідыум Белкаапсаюза прапанаваў кааперацыйным арганізацыям у дзень 8 сакавіка правесці работу па далейшаму вылучэнню лепшых стахановак-жанчын на адказную кіруючую работу. Пры прэзідыуме Белкаапсаюза адбудзецца нарада жанчын — старшынь сельскіх кааператываў з удзелам 20 стахановак і выдатніц прылаўка. Арганізуюцца курсы для падрыхтоўкі актывістак-жанчын на пасады старшынь сельскіх кааператываў.

ПАДАРУНАК КАЛГАСНІКУ АРЛОВУ

Усім вядомы самавучка мастак-мазаічнік калгаснік тав. Арлоў, які зрабіў мастацкі сундук для гістарычнага пісьма беларускага народу вялікаму Сталіну, атрымаў ад дырэкцыі Белдзяржкіно падарунак кінофільм «Гістарычнае пісьмо беларускага народу вялікаму Сталіну».

Тав. Арлоў будзе дэманстраваць гэты фільм у сваім калгасе, дзе ёсць кіноустаноўка, пасля ён перадасць фільм для паказу працоўным горада і раёна.

А. КАРАТКЕВІЧ.

ЦАЦКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ КАЛГАСНІКАЎ

У Беларускае аб'яднанне культтавараў з раёнаў паступаюць цяпер лікія заяўкі на дзіцячыя пацкі для сезонных калгасных дзіцячых пляцовак. Ужо ёсць заказы з 15 раёнаў — Дзяржынскага, Будакашалёўскага, Лельчыцкага і інш.

У бягучым годзе аб'яднанне культтавараў завязе ў калгасную вёску пацак на 1.500 тыс. руб. На 200 тыс. руб. ужо атрымана. У асартыменце больш тысячы назваў пацак — заводных, рухаючыхся, ваенізаваных — гарматы, танкі, разборны самалёт, авіяканструктар і т. д.

ХУТКАЯ ДАПАМОГА НА САМАЛЁЦЕ

У тав. Разгонава цяжка захварэў сын. Патрабавалася абавязковая адпраўка ў Менск, але ні поездам, ні на машыне адправіць хворага было немагчыма.

На дапамогу прышоў з Менску санітарны самалёт. Раніцою 25 лютага санітарны самалёт, пілатуемы лётчыкам тав. Нікіновым, падняўся ў паветра і ўзяў курс на Лепель. Праз 4 гадзіны хворы быў дастаўлен у Менск і змешчан у 2-ю совецкую больніцу, дзе яму была аказана кваліфікаваная медыцынская дапамога. Зараз сын тав. Разгонава адчувае сябе добра.

У сваім пісьме на імя народнага камісара аховы здароўя БССР тав. Бурачэўскага камдзіў тав. Сердзіч выказвае глыбокую падзяку лётчыку тав. Нікінаву за хуткую дастаўку цяжка хворага ў Менск.

Ал. ШПІТАЛЬНЫ.

АРМЕЙСКІЯ РЭКОРДЫ ПЛАЎЦОЎ БВА

У Маскве адбыўся вучэбна-трэніровачны збор плаўцоў РСЧА, які скончыўся асабістымі спаборніцтвамі па плаванню. На спаборніцтвах устаноўлена 10 новых усеармейскіх рэкордаў. Плаўцамі Беларускай ваеннай акругі былі ўстаноўлены 4 армейскія рэкорды, з іх адзін усесаюзны.

Чырвонаармеец менскага гарнізона т. Барыс Шэбашаў на 2 сек. палепшыў свой усесаюзны рэкорд на хуткасному нырэнню на 75 метраў, паказаўшы бліскучы рэзультат — 1 мін. 5 сек. Менскі чырвонаармеец Нікалай Капусцін паставіў армейскі рэкорд, праплыўшы 1.000 метраў вольным стылем за 14 мін. 26 сек. Ён-жа заняў першае месца на 200 метраў вольным стылем, не дастаўшы рэкорда РСЧА на 0,4 сек.

Трэнер па плаванню менскага Дома Чырвонай Арміі Міра Верэта паставіла 2 рэкорды РСЧА па плаванню на спіне для жанчын. На 100 метраў — 1 мін. 38,2 сек. і на 200 метраў — 3 мін. 32 сек. Трэнер менскага Дома Чырвонай Арміі тав. Савельеў заняў трэцяе месца на 100 метраў вольным стылем. Яго рэзультат — 1 мін. 5 сек. (на 6 сек. лепш усебеларускага рэкорда).

ПАВЕДАМЛЕННІ

Ніжэйпаіменаваныя ў спісу выключаныя з партыі ў перыяд абмену партдакументаў былыя члены і кандыдаты партыі выключаюцца ў т. Менск на Вышэйшую Тройку Парткалегіі камісіі партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б) на 9 сакавіка к 10 гадзінам раніцы ў памяшканне КПК (Чырвонаармейская, 16, 3-ці паверх).

Выключаныя па партарганізацыях:

Пятроўскі Іосіф Успінавіч, Сурбо Матвей Вікенцьевіч (Смалявіцкі раён); Валюкоў Шамафей Акімавіч (Церахаўскі раён); Родзіў Уладзімір Міхайлавіч, Пінчэнка Пётр Міхайлавіч, Шеленгоўскі Дзям'ян Фёдаравіч (Уваравіцкі раён); Коржэль Уладзімір Іванавіч, Махнач Віктар Канстанцінавіч, Петрашэўскі Іосіф Афанасьевіч (Уздзенскі раён); Каранько Браніслаў Канстанцінавіч (Халопеніцкі раён); Зайцаў Платон Ігнацьевіч (Хоцімскі раён); Койда Сцяпан Фёдаравіч (Чаўускі раён); Рошчанка Аніцей Ісаакавіч (Чашніцкі раён); Зубараў Герасім Пракоф'евіч, Левіт Шая Ізраілевіч (Чэрыкаўскі раён); Мышчык Трафім Васільевіч (Чэрвеньскі раён); Слюсберг Эля Матусеевіч (Чачэрскі раён); Палуйчык Міхаіл Цыпанавіч (Шкловскі раён).

ДЗЕННІК

— Інструкцыйны даклад для дакладчыкаў, прапагандыстаў і агітатараў аб Міжнародным комуністычным жаночым дні адбудзецца 5 сакавіка ў 7 гадзін вечара ў малым залі Дома партактыва.

Ад Глускага РК КП(б)Б

Украдзеную кандыдацкую картку ўзору 1936 года, выданую Глускім РК КП(б)Б на імя Суліма Уладзіміра Іванавіча за № 0550698, лічыць несапраўднай.

Сакратар Глускага РК КП(б)Б І. КРАЎЧАНКА.

Ад Клімавіцкага РК КП(б)Б

Украдзеную кандыдацкую картку ўзору 1936 г., выданую клімавіцкім РК КП(б)Б на імя Грышчанка Егора Дзем'янавіча за № 0549304, лічыць несапраўднай.

Сакратар Клімавіцкага РК КП(б)Б Я. КАГАН.

Ад Барысаўскага РК КП(б)Б

Згубленыя партыйныя білеты, выданыя на імя: Войніча Нікіфара Францавіча, партбілет № 0854321, Жалкевіча Міхаіла Ефімавіча, партбілет № 0873697, Каралёнкі Успіна Нікалаевіча, партбілет № 0873688, Гры́ф Барыса Евелевіча, партбілет № 0873578, Каменецкай Хаі Нісанаўнай, партбілет № 0854397, — лічыць несапраўднымі.

Сакратар Барысаўскага РК КП(б)Б МАЙСЕЕЎ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б

АБВЯШЧАЕ, што ў мэтах устанаўлення адзінага і пастаяннага часу перадачы завочнай партвучобы па радыё

з 1 сакавіка 1937 г.

РАДЫЁЛЕКЦЫІ завочнай партвучобы

будуць перадавацца

праз менскую радыёстанцыю РВ-10 замест раней існаваўшага часу 19 г. 30 м., у 18 г. 30 м.

Перадачы для завочнікаў курсаў калгаснага актыва і па пытаннях сельскай гаспадаркі будуць утварацца з 20 г. 30 м.

Увага: Лекцыі завочнай партвучобы праз маскоўскую станцыю імя «Комінтэрна» перадаюцца, як і раней, з 18 г. 30 м.

Інстытут прапануе ўсім райінструктарам завочнай партвучобы і загадчыкам радыёпартаўдыторый паладзіць сталае бесперабойнае слуханне радыёлекцый.

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б ЧЫЖОВА.

КОГИЗ ПАРТКНІГА

НОВАЯ КНІГА аб ПОЛЬШЧЫ

СОЦЭКГИЗ

ВРУБЛЕЎСКІ А. ПОЛЬША. 1936. Серыя «Капиталистический мир в очерках». Стар. 212 + 2 карты. Ц. у пер. 2 р.

Кніга асвятляе асноўныя рысы эканамічнага і соцыяльнага жыцця Польшчы, а таксама важнейшыя моманты знешняй палітыкі польскага фашызма і яго падрыхтоўку да вайны.

Патрабуйце ва ўсіх кніжных магазінах і кіёсках КОГИЗ'а і райкультмагах спажыўкааперацыі.

У выпадку адсутнасці кнігі на месцы, паштовыя заказы накіроўвайце па адрасу: Менск, Совецкая, 50, аддзяленне КОГИЗ'а.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР

АД 4 САКАВІКА НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

САПРАЎДНЫ ТАВАРЫШ

У фае іграе ДЖАЗ-АРКЕСТР Пад кіраўніцтвам Я. С. ГАРЭЛІКА.

РАДЫЁПЕРАДАЧА НА 5 САКАВІКА

8-30—Апошнія паведамленні. 16 — паэма «Мороз красный нос» Некрасава. 17—Дзецям аб Моцарце. 18-30 — завочная партвучоба. 19-30—песні народаў СССР. 20-15—революцыйныя песні. 20-30—выступленне саліста Дзяржаўнага тэатра Бароўскага. 21—мантаж оперы «Оле з Норляндa» Іпалітава-Іванава. 22—эстрада. 23—Апошнія паведамленні. 23-15—перадача на польскай мове.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

НАРКАМУНУТГАНДАЛЬ СССР

Беларускае аддзяленне „СОЮЗМЕХТОРГ“

даводзіць да ведама ўсіх грамадзян, што з 1 сакавіка праводзіцца

продаж футравых вырабаў у **РАСТЭРМІНОЎКУ**

ПРОДАЖ праводзяць наступныя магазіны:

У г. МЕНСКУ — Ленінская, 16, « - » — Совецкая, 71.
У г. ГОМЕЛІ — Совецкая, 2.
У г. МАГІЛЕВЕ — Першамайская, 21.
У г. ВІЦЕБСКУ — вул. «Праўды», 3
У г. БАБРУЙСКУ — Соцыялістычная, 122.

У ВЫБАРЫ ЁСЦЬ:

МАНТО і ЖАКЕТЫ з крота, белкі, кроліка, п/коцік, аўчыны цыгейскай, кроліка п/собаль, ПІДЖАКІ мужч., СКУРКІ КАРАКУЛЯ чорнага, ЛІСІЦА чорнабурая натуральная, ПЯСЦЫ і т. д.

УМОВЫ ПРОДАЖУ ФУТРАВЫХ ВЫРАБАЎ У РАСТЭРМІНОЎКУ:

Футровыя вырабы адпускаюцца ў РАСТЭРМІНОЎКУ коштам не ніжэй 500 руб.

Пры пакупцы футровай рэчы ў РАСТЭРМІНОЎКУ пакупнік уносіць аванс у памеры 25 проц. яе кошту.

Чысло і тэрміны астатніх плацяжоў устанаўліваюцца па ўзгадненню паміж магазінам і пакупнікам, з тым, каб АПОШНІ ПЛАЦЕЖ быў зроблен НЕ ПАЗНЕЙ 30 верасня 1937 г.

Да поўнай аплаты кошту набытай рэчы, апошняя астаецца ў магазіне на адказным за хаванні.

У выпадку пратэрміноўкі ўзносу дагаворных плацяжоў запродаж лічыцца скасаваным і ўсе ўнесеныя сумы неадкладна вяртаюцца пакупніку.

ПРОДАЖ футравых вырабаў у РАСТЭРМІНОЎКУ праводзіцца па дзейнічаючаму прэйскуранту, г. зн. па цэнах, устаноўленых для продажу футравых вырабаў за наяўны разлік.

БЕЛ. АДДЗ. «СОЮЗМЕХТОРГ».

25 мая — ПЕРШЫ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)

АД НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ФІНАНСАЎ САЮЗА ССР

З прычыны таго, што пераважная маса трымальнікаў дзяржаўных пазык правяла ўжо ў сувязі з канверсіяй абмен аблігацый раней выпушчаных унутраных дзяржаўных пазык на аблігацыі Пазыкі Другой Пяцігодкі (выпуск чацвертага года), а таксама ўлічваючы, што аблігацыі гэтай пазыкі па падпісцы 1936 г. будуць разданы ўсім падпісчыкам у першай палове мая г. г.

ПЕРШЫ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

(выпуск чацвертага года)

прызначаецца на 25 мая 1937 г. у Маскве.

ТРЫМАЛЬНІКІ ДЗЯРЖПАЗЫК, ЯКІЯ ЗДАЛІ АБЛІГАЦЫІ ПАД ССУДЫ І НЕ ПАГАСЯЦЬ ССУДЫ ДА ПАЧАТКУ ТЫРАЖУ, ПАЗБАЎЛЯЮЦЦА МАГЧЫМАСЦІ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ТЫРАЖАХ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ЗАКЛАДЗЕНЫХ ІМІ АБЛІГАЦЫЯХ ДЗЯРЖПАЗЫК.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1) ВАЎКІ І АВЕЧКІ Абанемент № 49.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР ТРАКЦІРШЧЫЦА Абанемент № 83.

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ДАРЫКО

Гукавы кінотэатр „Пролетарый“ ЮНАЦТВА ПАЭТА

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЗЯМЛЯ Ў ПАЛОНЕ

Гукавы кінотэатр «Спартак» ДВА ДНІ

КІРАЎНІЦТВА САНАТОРНА-ПРАФІЛАКТЫЧНЫХ УСТАНОЎ (КСПУ) ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ ПРОФСАЮЗАЎ, ШТО ЯНЫ МОГУЦЬ

НАБЫЦЬ ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК ПУЦЁЎКІ НА САКАВІК І КРАСАВІК МЕСЯЦЫ У ДАМЫ АДПАЧЫНКУ:

ЖДАНОВІЧЫ (Менск); КЛЕНІКІ (Гомель); МАГІЛЕЎ; БАБРУЙСК; ОРША; ЗАОЛЬША (Віцебск); БАРЫСАЎ і ў туберкулёзны санаторый «САСНОЎКА».

ПРОДАЖ ПУЦЕВАК ПРАВОДЗІЦЦА КСПУ (Дом працы, другі паверх, пакой № 10) або непасрэдна ў адпаведных дамах адпачынку. Бягучы рахунак КСПУ ў Белканторы Дзяржбанка № 558006. Тэл. № 25-240.

КСПУ ЦСПСБ.

МАГІЛЕЎСКІ АЎТАРАМОНТНЫ ЗАВОД ІМЯ КІРАВА

прымае ў рамонт

АЎТАМАБІЛЬНЫЯ МАТОРЫ „ГАЗ“,

выдаючы ў дзень прыёмкі ўзамен прынятых АДРАМАНТАВАНЫЯ маторы.

ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

5 САКАВІКА Ў 6 ГАДЗІН 30 МІНУТ ВЕЧАРА, У ПРЫРОДАЗНАЎЧЫМ КОРПУСЕ (трэці паверх, 318-я аўдыторыя)

НАПАДЖВАЕ СУСТРЭЧУ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ

З ВУЧНЯМІ 10-Х КЛАСАЎ, ДЫРЭКТАРАМІ ШКОЛ, ЗАГАДЧЫКАМІ НАВУЧАЛЬНЫХ ЧАСТАК І ВЫКЛАДЧЫКАМІ,

дзе будуць праведзены гутаркі і дэманстрацыі навуковымі работнікамі і выкладчыкамі-студэнтамі.

РЭКТАРЫЯТ.